Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 ЛІПЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 134 (29001)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА



ЗО ДЗЁН, КАБ ПЕРАЙСЦІ НА РОДНУЮ МОВУ 3

ДЗІЦЯЧЫ САДОК У... ЖЫЛЫМ ДОМЕ МС

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КРУТОЙ, міністр эканомікі:

«З мінулага года ў краіне вельмі сур'ёзна стала падымацца тэма нашага рэгіянальнага развіцця. Парламентарыі атрымалі заданне, пакуль папярэдняе, паглядзець аж да адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення рэспублікі, якое апошні раз было зафіксавана ў 1960-х гадах, і сёння з улікам развіцця, урбанізацыі, дэмаграфіі, міграцыі, натуральна, мае патрэбу ў пэўных карэкціроўках. Мы вывучалі вопыт краін Еўрасаюза: Вялікабрытаніі, Германіі, скандынаўскіх краін. Кожная з іх па-свойму вырашае праблему тэрыторый, дзе эканамічнае развіццё адстае ад сярэдняга. Тут мы ў першую чаргу чакаем вынікаў перапісу насельніцтва, які адбудзецца ў канцы года».

АГУЛЬНАСЦЬ ЧАЛАВЕЧЫХ ЛЁСАЎ



Фота БелТА.

У пленарным пасяджэнні VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ўзялі ўдзел кіраўнікі краін

Падчас свайго выступлення Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на ўзаемадзеянне Беларусі і Расіі ў розных галінах, асабліва па лініі гуманітарнага супрацоўніцтва і рэгіянальных сувязяў, адзначыўшы агульнасць гісторыі народаў дзвюх краін. Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў важнасць эфектыўнай маладзёжнай палітыкі і закрануў тэму інтэграцыі.

СТАР. 2

ПУНКТ АДЛІКУ

Фота БелТА.

«Нулявы кіламетр» сучаснай еўрапейскай геадэзіі знойдзены ў Браслаўскім раёне.

Пункт, з якога пачалася пабудова ў цэлым агульнаеўрапейскай геадэзічнай сеткі, выяўлены на ўзгорку паблізу аграгарадка Дрысвяты ў Браслаўскім раёне. Ён быў знойдзены па выніках высокадакладных сучасных вымярэнняў. Работы па яго пошуку вяліся агулам каля 20 гадоў. А пачалося ўсё з адшукання пунктаў Геадэзічнай дугі Струвэ, якая ўваходзіць у пералік аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

КОРАТКА

- Рэстаўрацыю Косаўскага палацава-паркавага ансамбля плануюць завяршыць у 2020 годзе.
- **З пачатку года больш за 18 тысяч чалавек звярнуліся па медыцынскую дапамогу з-за ўкусаў кляшчоў.**
- У Гомелі і Гомельскім раёне правераць веласіпедыстаў на веданне ПДР.
- **Праваслаўныя паломнікі пройдуць хросным ходам з Магілёва ў Баркалабава.**

- У БДУ 66,5 % абітурыентаў маюць сумарны бал вышэйшы за 300.

ISSN 1990 - 763X

Брэст 1000 год!

НАБЯРЭЖНАЯ МУХАЎЦА — ПРАСТОРА ДЛЯ ГАРАДЖАН

Сад бесперапыннага цвіцення, вулічныя трэнажоры, арт-аб'екты ствараюць новы вобраз прывычнай вуліцы

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Хто даўно не быў у раёне брэсцкай набярэжнай уздоўж Мухаўца, яе дакладна не пазнае. Яна (вуліца называецца Набярэжная Францыска Скарыны. — Аўт.) не проста прыбралася да будучага юбілею горада, а літаральна перамянілася.

Цяпер гэта іншая гарадская прастора. У ёй можна заўважыць ноткі заходняга горада, адчуць адгалоскі асаблівага паху паўднёвых курортных гарадоў. У ёй няма шуму-тлуму пешаходнай Савецкай, перанасычанай малымі архітэктурнымі формамі і аб'ектамі грамадскага харчавання. Затое прысутнічаюць спакой, размеранасць і магчымасць сузірання, якія дае блізкасць вады. А старыя дрэвы, удала ўпісаныя ў новы ландшафт, пакідаюць адчуванне парку. Многія гараджане паспелі ацаніць набярэжную і рэгулярна прыходзяць сюды гуляць.

А між тым набярэжная гэта таксама аб'ект тысячагоддзя. Яе добраўпарадкаванне было ўключана ў план па падрыхтоўцы да святкавання юбілею.

СТАР. 4

АГУЛЬНАСЦЬ ЧАЛАВЕЧЫХ ЛЁСАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сярод іншага Аляксандр Лукашэнка прапанаваў абдумаць магчымасць падачы сумесных з Расіяй заявак на правядзенне буйных міжнародных спартыўных форумаў. Кіраўнік нашай дзяржавы нагадаў, што краіны ўжо прымалі самыя маштабныя міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы: леташні чэмпіянат свету па футболе ў Расіі і II Еўрапейскія гульні, што нядаўна адбыліся ў Беларусі.

«Магчыма, нам варта падумаць пра правядзенне падобных спаборніцтваў у рамках адзінай заяўкі Беларусі і Расіі з фінансаваннем за кошт бюджэту Саюзнай дзяржавы. Гэта дазволіць стымуляваць развіццё турыстычнай галіны ў нашых краінах», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзімір Пуцін са свайго боку прапанаваў сумесна рыхтаваць атлетаў абедзвюх краін з выкарыстаннем спартыўнай інфраструктуры Беларусі і Расіі, у прыватнасці да летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа і зімовых у Пекіне.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў таксама, што сувязі паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі складаліся дзесяцігоддзямі і шмат у чым вызначаны агульнасцю гісторыі і чалавечых лёсаў. Ён назваў 75-годдзе зняцця блакады Ленінграда і вызвалення Беларусі, што адзначаецца сёлета, і 75-годдзе Перамогі ў наступным годзе важнымі для яднання беларусаў і расіян, умацавання ідэалагічных асноў Саюзнай дзяржавы.

Фота БелТА.

Уладзімір Пуцін, у сваю чаргу падкрэсліў, што нашы краіны ўзмацняюць палітычнае і эканамічнае ўзаемадзеянне ў рамках Саюзнай дзяржавы, актыўна ўдзельнічаюць у дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюзу, фарміраванні адзіных рынкаў тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы, цесна супрацоўнічаюць у іншых рэгіянальных арганізацыях.

Акрамя таго, Прэзідэнт Расіі паведаміў, што прапрацоўваецца магчымасць выдзялення дадатковых бюджэтных месцаў у расійскіх ВНУ для беларусаў. Па яго словах, цяпер у Расіі на бюджэтнай аснове вучыцца каля чатырох тысяч беларусаў. Для спрашчэння паступлення ў 2020 годзе плануецца праводзіць у Мінску Адзіны дзяржаўны экзамен.

Аляксандр Лукашэнка заявіў і аб наяўнасці прынцыповых дамоўленасцяў з Уладзімірам Пуціным па інтэграцыйнай тэматыцы.

Паводле БелТА.

САМЫЯ БЛІЗКІЯ ПАРТНЁРЫ І САЮЗНІКІ

Часу для вырашэння праблем — дастаткова

Аляксандр Лукашэнка прапануе да дваццацігоддзя Саюзнага дагавора ў снежні 2019 года зняць усе праблемныя пытанні ў адносінах Беларусі і Расіі. Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў на перагаворах з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у Санкт-Пецярбургу.

«Ніводнай праблемы, я так мяркую, мы не павінны вынесці за межы гэтага тэрміну. Гэта нас прыціскае. Што мы будзем казаць у 20-годдзе? Няма чаго будзе сказаць, калі мы не знімем ўсе пытанні, якія ёсць, і не падпішам праграму, як вызначыць стратэгію нашых сумесных дзеянняў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Яго расійскі калега адзначыў неабходнасць працягнуць дыскусіі, пачатыя яшчэ напярэдадні на нефармальнай сустрэчы, а таксама абмеркаваць пытанні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

«Мы з Аляксандрам Рыгоравічам вырашылі прааналізаваць усё, што зроблена ў рамках Саюзнага дагавора, што не зроблена, па якіх прычынах. І выпрацаваць прымальныя для нашых краін шляхі далейшага развіцця інтэграцыі», — паведаміў Уладзімір Пуцін.

Ён асабліва падкрэсліў, што Беларусь, безумоўна, — самы блізкі стратэгічны партнёр і саюзнік Расіі. Аляксандр Лукашэнка згадзіўся, што часам вырашэнне нейкіх пытанняў затрымліваецца па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах, і проста размаўляць ужо недастаткова.

«Трэба прымаць рашэнне. Ад нас гэтага ўжо чакаюць не толькі журналісты, спецыялісты, але і звычайныя людзі. Гэта праўда. Таму момант характарызуецца тым, што трэба прымаць рашэнне», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Ён паведаміў, што канкрэтныя дзеянні вызначаныя, створана сумесная група на ўзроўні ўрадаў.

«Мы сёння маем праграму — гэта больш-менш стратэгічны дакумент. І мы сёння маем вялікі аб'ём цяперашніх праблем. Група і ўрады гэтыя праблемы бачаць. І праграму выпрацавалі, якая, па ўрадавых ацэнках, на 80—90 % узгоднена», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што без вырашэння канкрэтных пытанняў размаўляць пра стратэгію проста смешна, таму падтрымлівае прапанову ўрадаў адначасова вырашыць усе праблемы да 20-годдзя дагавора.

«Часу аж замнога», — перакананы Прэзідэнт Беларусі.

Двухбаковая сустрэча лідараў апярэдзіла іх удзел у пленарным пасяджэнні VI Форума рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Напярэдадні прэзідэнты мелі зносіны ў нефармальнай абстаноўцы — наведалі Валаамскі і Конеўскі мужчынскія манастыры, што месцяцца на астравах у Ладажскім возеры. За паездку па святых месцах Аляксандр Лукашэнка асобна падзякаваў Уладзіміру Пуціну.

Паводле БелТА.

На канферэнцыю

Генсек ААН Антоніу Гутэрыш упершыню наведае Беларусь

Генеральны сакратар прыме ўдзел у міжнароднай канферэнцыі высокага ўзроўню «Барацьба з тэрарызмам пры дапамозе інавацыйных падыходаў і выкарыстанне новых і ўзнікаючых тэхналогій». Канферэнцыю арганізуюць сумесна Беларусь і ААН, яна пройдзе ў Мінску 3-4 верасня.

Падрыхтоўку мерапрыемства **пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ААН Валянцін РЫБАКОЎ** і **генсек Арганізацыі аб'яднаных нацый Антоніу ГУТЭРЫШ** абмеркавалі падчас сустрэчы ў штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку. Бакі абмяняліся поглядамі на найбольш актуальныя пытанні ў сферы міжнародных адносін, а таксама на стан і перспектывы супрацоўніцтва Беларусі і ААН.

Антоніу Гутэрыш высока ацаніў намаганні Беларусі ў галіне ўмацавання міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі.

Апошні раз генеральны сакратар ААН наведваў Беларусь з афіцыйным візітам у 1994 годзе — тады гэтую пасаду займаў Бутрас Бутрас-Галі.

Паводле інфармацыі МЗС.

Адказы на важныя пытанні

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 20 ліпеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На званкі з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Васілевіч КРАЎЦОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Васіль Іванавіч АКУЛІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трамп назваў галасаванне па імпічменце «самым смешным праектам» у сваім жыцці



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп лічыць галасаванне па адхіленні яго ад пасады ў Палаце прадстаўнікоў Кангрэса «самым смешным праектам» у сваім жыцці.

«Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША толькі што пераважнай большасцю заблакавала рэзалюцыю па імпічменце. Гэта, верагодна, найбольш смешны і марнатраўны праект з усіх, над якімі мне калі-небудзь даводзілася працаваць», — напісаў Трамп у Twitter.

У сераду Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША заблакавала пачатак працэдуры адхілення Трампа ад пасады, ініцыяваную кангрэсменам Элам Грынам ад штата Тэхас, які прадстаўляе дэмакратычную партыю. Грын прапаноўваў пачаць працэдуру імпічменту пасля абразлівых выказванняў прэзідэнта на адрас некалькіх жанчын — прадстаўніц дэмакратычнай партыі ў Кангрэсе. За тое, каб заблакаваць гэтую ініцыятыву, прагаласавалі 332 кангрэсмены, 95 выказаліся супраць, яшчэ адзін устрымаўся.

Нагадаем, што ў мінулую нядзелю Трамп дапусціў у адрас жанчын з апазіцыйнай дэмакратычнай партыі выказванні ў Twitter, расцэненыя многімі як абразлівыя і расісцкія.

Мексіканскі наркабарон Эль Чапа атрымаў у ЗША пажыццёвы тэрмін і яшчэ 30 гадоў турмы

Бруклінскі федэральны суд у Нью-Ёрку прысудзіў мексіканскага наркабарона Хаакіна Гусмана па мянушцы Эль Чапа (Карантышка) да пажыццёвага турэмнага зняволення, а звыш таго — яшчэ да 30 гадоў турмы і штрафу ў памеры 12,6 мільярда долараў, паведамляе служба Бі-бі-сі.

62-гадовага кіраўніка наркакартэля «Сіналоа» называюць самым вядомым злачынцам сучаснасці. Па версіі пракуратуры, Гусман нясе адказнасць за кантрабанду ў ЗША 155 тон какаіну на працягу 25 гадоў, а таксама іншых наркотыкаў. Акрамя таго, яго абвінавачваюць у забойстве, злачыннай змове і іншых злачынствах. У лютым 2019 года пасля чатырохмесячнага разгляду справы Гусмана суд прызнаў яго вінаватым па ўсіх 10 пунктах абвінавачванняў. Пракуроры патрабавалі прысудзіць яго да пажыццёвага тэрміну і дадатковага трыццацігадовага зняволення. Як чакаецца, Гусман будзе адбываць пакаранне ў турме максімальна строгага рэжыму ў Флорэнсе, штат Каларада. Гэтую турму таксама называюць «горным Алькатрасам», бо там дзейнічае рэжым супермаксімальнай бяспекі. Абарона Гусмана паведамляла, што ён неаднаразова скардзіўся на ўмовы ўтрымання — у прыватнасці, на тое, што ў яго камеры без вокнаў увесь час гарыць святло. У сераду наркабарон апошні раз змог пабачыцца са сваёй жонкай і двума дочкамі.

Адвакат Эдуарда Баларэса назваў патрабаванні абвінавачвання фарсам і адзначыў, што прысуд Гусману не зменіць сітуацыю з вайной наркакартэляў у Мексіцы.

У Расіі паскорылася змяншэнне насельніцтва

Натуральнае змяншэнне насельніцтва Расіі па выніках пяці месяцаў 2019 года склала 180,4 тысячы чалавек, згодна з данымі Расстата па натуральным руху насельніцтва ў Расіі.

За аналагічны перыяд мінулага года гэты паказчык склаў 147,2 тысячы. Такім чынам, натуральнае змяншэнне насельніцтва за пяць месяцаў вырасла сёлета больш чым на 33 тысячы чалавек. Па звестках ведамства, колькасць народжаных па выніках першых пяці месяцаў 2019 года склала 600 тысяч, а колькасць памерлых — 780 тысяч чалавек. Раней віцэ-прэм'ер РФ Таццяна Голікава заявіла, што Расія катастрафічна губляе насельніцтва. Паводле яе слоў, нараджальнасць працягвае падаць, а смяротнасць зніжаецца не такімі хуткімі тэмпамі, як хацелася б.

У АБНОЎЛЕНЫМ ВЫГЛЯДЗЕ

Да канца сакавіка 2020 года павінны быць завершаны работы па рэканструкцыі званіцы і брацкага корпуса Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра.

У маі 2020 года, перадае **БелТА**, адзначацца 550-годдзе з часу з'яўлення Жыровіцкай іконы Божай Маці і 500-годдзе заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра.

«Манастыр, — адзначыла ў час яго наведвання **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА,** — значная праваслаўная святыня. Юбілейныя даты не застануцца па-за ўвагай. Святочныя мерапрыемствы прыцягнуць вялікую колькасць гасцей. Важна правесці свята на самым высокім узроўні. Падрыхтоўка да яго ўжо стартавала. У найбліжэйшы час будзе створаны арганізацыйны камітэт, прапрацавана канцэпцыя свята».

Падчас наведвання манастыра кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта азнаёмілася з ходам работ па рэканструкцыі яго аб'ектаў. Раней, у прыватнасці, быў уведзены ў эксплуатацыю будынак трапезных з гасцініцай для паломнікаў.

Неўзабаве пачнуцца работы па рэканструкцыі брацкага корпуса. Яны прадугледжваюць абнаўленне фасада, даху, замену вокнаў і дзвярэй, іншыя рамонтныя работы. Праект ужо гатовы і праходзіць экспертызу. Таксама вядуцца праектныя пошукі па рэстаўрацыі званіцы манастыра.

«Важна завяршыць гэтыя работы да канца сакавіка 2020 года, каб да святочных мерапрыемстваў аб'екты паўсталі ў абноўленым выглядзе. Пры гэтым асаблівую ўвагу трэба надаць якасці: памылак, пралікаў на аб'ектах такога ўзроўню быць не можа», — адзначыла Наталля Качанава. Яна таксама звярнула ўвагу на неабходнасць дбайнага і ўзважанага падыходу да добраўпарадкавання аграгарадка Жыровічы.

План падрыхтоўкі да свята прадугледжвае рэканструкцыю, рамонт і ўвод у эксплуатацыю каля 30 аб'ектаў.

Сацыяльны праект

30 ДЗЁН,
КАБ ПЕРАЙСЦІ НА БЕЛАРУСКУЮ

Наша мова існуе не толькі ў падручніках, але і ў рэальным жыцці

15 ліпеня пачаўся цікавы сацыяльны праект — інстаграм-шоу «Мова чэлендж». У яго ўдзельнікаў будзе роўна месяц, каб перайсці на карыстанне беларускай мовай. Два разы на тыдзень героі шоу будуць атрымліваць заданні, і так па нарастаючай: з кожным заданнем яны ўсё часцей будуць выкарыстоўваць у сваім жыцці родную мову. Шоу транслюецца ў фармаце сторыз у інстаграме @artsiadziba, а таксама ў інстаграмах яго ўдзельнікаў.

«Калі ты таксама хацеў перайсці на беларускую мову, далучайся! — заклікаюць многія ўдзельнікі шоу. — Давайце пакажам усім, што наша мова існуе не толькі ў падручніках, але і ў рэальным жыцці!»

* * *

— Са 107 заявак мы адабралі 31 удзельніка, — кажа **дырэктар культурнай пляцоўкі «Арт-сядзіба» і адзін з ініцыятараў шоу «Мова чэлендж» Алесь СНЕГ.** — Мы ўлічвалі не толькі зацікаўленасць у праекце, але глядзелі і на тое, ці ўмеюць людзі здымаць добрае відэа. Гэта важна для таго, каб тыя, хто будзе сачыць за праектам, не проста назіралі, але натхняліся і таксама пераходзілі на беларускую мову, пачыналі ёй карыстацца ў паўсядзённым жыцці.

Вельмі прыемна, што адгукнулася шмат школьнікаў. Многія лічаць, што нашы дзеці не цікавяцца роднай мовай, абыякава да яе ставяцца і яна ім амаль непатрэбна. Але шматлікія заяўкі, атрыманыя ад 14—16-гадовых маладых людзей, паказалі, што гэта не так. Акрамя гэтага, паступалі заяўкі ад студэнтаў і дарослых людзей «за 40» і нават «за 50» гадоў. Самаму маладому нашаму ўдзельніку 13 гадоў, самаму сталаму — 51 год. Большасць людзей — школьнікі або студэнты першых курсаў. Так што не маюць рацыі тыя, хто кажа, што сённяшняй моладзі нічога не трэба! Таксама сярод удзельнікаў кастынгу ёсць супрацоўнікі і Чырвонага Крыжа, і Кіеўскага тэлебачання, і знакамітых Cirque du Soleil, EPAM, UBER і многіх іншых кампаній.

Два разы на тыдзень мы будзем даваць праз «Інстаграм» удзельнікам шоу заданні, звязаныя з беларускай мовай, якія яны мусяць выканаць. У гэты панядзелак мы даслалі ўсім першае заданне — знайсці кнігу на беларускай мове і прачытаць яе, а таксама зняць гэты этап на відэа, расказаць пра свае думкі і пачуцці ў сувязі з гэтым. Спадзяёмся, што іншыя людзі будуць раіць нашым героям, якія кнігі ім варта прачытаць.

* * *

Такім чынам, гэтым летам усе ахвотныя змогуць сачыць за захапляльным, натхняльным і прыгожым шоу. І магчыма, хтосьці з гледачоў скажа следам за адной з яго ўдзельніц Ірынай Ціханскай: «Буду спадзявацца, што з гэтага дня пачну размаўляць цалкам на роднай мове!»

Святлана БУСЬКО.

Надвор'е

Лета вяртаецца

У бліжэйшыя дні сонца зноў прыпячэ да плюс 30 градусаў

Больш за два тыдні ў нашай краіне ўтрымліваецца няўстойлівае надвор'е з тэмпературным фонам на 2—6 градусаў ніжэй за сярэднія шматгадовыя значэнні. Але ў гэтыя выхадныя дні надвор'е палепшыцца — значна пацяплее, і дажджоў будзе менш. Тэмпературны фон вернецца ў рамкі кліматычнай нормы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння пад уплывам атмасферных франтоў пераважна па паўночна-ўсходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ад плюс 18 градусаў па паўночным усходзе да 26 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У суботу ўмовы надвор'я будзе ў асноўным вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах Брэсцкай вобласці магчымы кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 градусаў да плюс 14 градусаў, удзень будзе ад плюс 21 градуса па паўночным усходзе да 28 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Але па-сапраўднаму прыпякаць пачне ў нядзелю. У гэты дзень, 21 ліпеня, уначы ў вобласці павышанага атмасфернага ціску будзе без ападкаў, а ўдзень з тэрыторыі Польшчы на захад Беларусі перамесціцца атмасферны фронт. Месцамі, па заходняй частцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 цяпла. Удзень будзе ад плюс 23 да плюс 29 градусаў, па Брэсцкай вобласці паветра прагрэецца да 30 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак атмасферныя франты прынясуць уначы ў заходніх і цэнтральных раёнах, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—18 цяпла, а ўдзень — ад плюс 20 да плюс 27 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Ліга чэмпіёнаў

«Задача не змянілася — патрабавалася забіваць»

Футбалісты БАТЭ выйшлі ў другі кваліфікацыйны раунд Лігі чэмпіёнаў

У паядынку ў адказ 1-га круга кваліфікацыі на поле гарадскога стадыёна ў Глівіцы чэмпіёны Беларусі заваявалі валявую перамогу над польскім «Пяста» — 2:1. На 21-й хвіліне Якуб Чэрвіньскі трапіў у вароты гасцей, а ў другой палове сустрэчы, калі да фінішу другога тайма заставалася ўсяго 15 хвілін, барысаўчане зарабілі пенальці, якое рэалізаваў Эрвейн Мукам. Павялічыў лік матча Захар Волкаў.

— Мы прапусцілі ў пачатку, тым не менш наша задача не змянілася: патрабавалася забіваць. Адзінае, рабілі шмат браку ў простых сітуацыях, з прычыны чаго заставаліся без мяча. А так атрымаўся звычайны дабротны еўракубкавы матч. Сапернік вельмі сур'ёзны і майстравіты. Але гэта футбол. Гаспадары забілі адзін мяч, мы два — і прабіліся ў наступны этап, — адзначыў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксей БАГА.** — *У Еўропе на футболе заўсёды добры антураж, а калі трыбуны падтрымліваюць не толькі сваіх, але і сапернікаў, — гэта вельмі выдатна. Вялікі дзякуй фанатам і БАТЭ, і «Пяста». Цяпер наша задача — аднавіцца і рыхтавацца далей.*

У другім раўндзе кваліфікацыі галоўнага кантынентальнага турніру БАТЭ сустрэнецца з нарвежскім «Русенборгам». Чэмпіён Нарвегіі двойчы перамог паўночнаірландскі «Лінфілд» — 2:0 (у гасцях) і 4:0 (дома). Першы матч БАТЭ і «Русенборга» адбудзецца ў Барысаве 24 ліпеня, паўторны — 31 ліпеня ў Тронхейме.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

НАБЯРЭЖНАЯ МУХАЎЦА — ПРАСТОРА ДЛЯ ГАРАДЖАН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

За два гады на паляпшэнне ўчастка набярэжнай ад бульвара Шаўчэнкі да вуліцы Леніна накіравана шэсць мільёнаў рублёў. За гэты час рэкрэацыйная зона літаральна пераўтварылася. З'явіліся арыгінальныя лаўкі, новыя пешаходныя і роварныя дарожкі. Тут паставілі вулічныя трэнажоры для заняткаў фізкультурай. Абсталявалі дзіцячую гульнявую пляцоўку. Усталявалі спускі да вады і прычалы для маламерных суднаў. І гэта толькі частка пералічанага, павярхоўны зрэз. Галоўнае, што дадалася нейкая ўтульнасць як неад'емная частка вобраза набярэжнай.

Асабліва яна зайграла, калі вясной тут адкрылі арт-аб'ект — сонечны гадзіннік. Ён складаецца з 16 мініяцюр — славутасцяў абласнога цэнтра. Тут знайшлі сваё ўвасабленне музей «Бярэсце», Холмскія вароты і галоўны ўваход у крэпасць, храмы, вакзал і іншае. Па гэтым гадзінніку можна не толькі вызначаць час, але і вывучаць гісторыю горада, якая вяршыцца і ў год святкавання тысячагадовага юбілею.

Бо менавіта сёлета тут з'яўляецца шмат цікавых рэчаў, яны будуць існаваць і развівацца ў горадзе далей. Ну вось, напрыклад, на пачатку лета свае намаганні аб'ядналі грамадскія арганізацыі і пры падтрымцы адміністрацыі Ленінскага раёна ператварылі невялікі куток набярэжнай у квітнеючы сад у прамым сэнсе. У першую суботу чэрвеня тут быў пасаджаны сад бесперапыннага цвіцення. Клімат, як вядома, змяніўся ў бок пацяплення, таму спецыялісты палічылі магчымым вырошчваць у Брэсце нават тыя расліны, якія раней выглядалі для нас экзатычнымі, напрыклад, разоўнік карэявідны — рэдкі і прыгожы куст. Былі пасаджаны розныя дрэвы і кусты, у тым ліку саджанцы розных відаў дуба.

Не так далёка ад саду радуе малечу прыгожая і арыгінальная дзіцячая пляцоўка, дзе ў пагодныя дні яна адводзіць душу. Для прадстаўнікоў старэйшага пакалення ўстаноўлены лаўкі-крэслы, яны зробленыя з дошак, на іх прыемна прытуліцца спінай і зручна назіраць, як гуляюць дзеці і трэніруюцца дарослыя. Упрыгожвае набярэжную і новы будынак па пракаце катамаранаў ды лодак. Яго ўзвёў прадпрымальнік. Другі інвестар будуе новае кафэ, якое павінна запрацаваць да верасня.

Брастаўчане Ларыса і Сяргей Ахрэмукі прыходзяць на набярэжную фактычна кожны дзень. Вось як яны выказаліся, дапаўняючы адно аднаго: «Мы жывём побач, і ходзім сюды фактычна з таго моманту, як атрымалі кватэру па вуліцы Інтэрнацыянальнай. А цяпер, калі выйшлі на пенсію, гэтая мясціна стала кутком адпачынку, рэлаксу, прыемных успамінаў. Зараз набярэжная змяняецца на вачах. Сюды прыходзіць шмат людзей. Мамы і таты гуляюць з дзецьмі. Што

асабліва прыемна, тут захоўваюцца спакой, размеранасць. Мы на Савецкую не пайшлі б, бо там шмат музыкі, яды і напояў, там свайго роду маладзёжная прастора. А тут месца для ўсіх — гэткія «Елісейскія палі», калі хочаце. Нам падабаецца тут гуляць, таму і прыходзім».

Гараджане іншымі словамі агучылі тое, аб чым гаварыў **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** падчас адкрыцця сонечнага гадзінніка. Мэр тады падкрэсліў, што развіццё вуліцы было вызначана ў якасці аднаго з трэндаў горада. У перспектыве па ёй можна будзе дайсці да гарадскога саду, выйсці ў цэнтр і накіравацца далей — у крэпасць. А **намеснік старшыні гарвыканкама Мікалай ЯКУБОЎСКІ** адзначыў, што мэтай добраўпарадкавання бачыцца набярэжная як зона круглагадовага адпачынку гараджан, такім чынам патокі адпачывальнікаў з вуліцы Савецкай будуць перараз мяркоўвацца сюды. Калі ж рачны порт канчаткова вынесуць за горад, набярэжная працягнецца да Брэсцкай крэпасці і, магчыма, будзе прадоўжана ў адваротным напрамку.

* * *

Брэст актыўна рыхтуецца да свайго юбілею. Афіцыйныя святкаванні і асноўныя мерапрыемствы гарадскога Міленіума пройдуць 6—8 верасня. Як паведамілі ў гарвыканкаме, гэты час выбраны для зручнасці гараджан: скончацца канікулы, пройдзе пік адпускнога сезона. Напярэдадні святкаванняў, 5 верасня, адбудзецца II Эканамічны форум гарадоў-пабрацімаў і партнёраў Брэста. Свой удзел пацвердзілі прадстаўнікі Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі, чакаецца ўдзел бізнесменаў з Ізраіля, ЗША, Кітая.

Мерапрыемствы на любы густ прапануе святочная афіша. Міжнародны дзіцячы фестываль тэатраў і кніг «Кніжная шафа» пройдзе 6 верасня. Вечарам гэтага дня на плошчы Леніна адбудзецца гісторыка-музычная кампазіцыя, прысвечаная пачатку святкавання тысячагоддзя. А на некалькі гадзін раней афіцыйна адкрыюць новую экспазіцыю археалагічнага музея «Бярэсце». Таксама будзе ўрачыста ўведзены ў эксплуатацыю Заходні абыход. Гэта развязка дапаможа разгрузіць ад транспарту цэнтральныя магістралі горада і азначае новы ўзровень якасці жыцця абласнога цэнтра. Таму Заходні абыход можна лічыць галоўным аб'ектам тысячагоддзя.

Кульмінацыяй святкавання стане 7 верасня. У розных частках горада разгорнуцца тэматычныя пляцоўкі. На вуліцах Гогаля і Савецкай запрацуюць кірмашы народных майстроў. На пешаходнай Савецкай будзе панаваць атмасфера творчасці, можна паслухаць канцэрты, наведаць выстаўкі. У парку культуры і адпачынку запланавана свая канцэртная праграма. А вось у парку тысячагоддзя горада будзе закладзена капсула з пасланнем нашчадкам. А 16-й гадзіне пачнецца маляўнічы карнавал. Шэсце пройдзе па праспекце Машэрава і працягнецца па вуліцы Леніна. Галоўная канцэртная пляцоўка размесціцца на Вяслярным канале, дзе ў 20 гадзін пачнецца музычна-гістарычная кампазіцыя «Міленіум». Яна закончыцца феерверкам.

Гулянні ў гонар юбілею працягнуцца 8 верасня. Міжнародны парад аркестраў на вуліцы Леніна зменіць фестываль вулічных тэатраў. А на набярэжнай, якая падрыхтавалася да свята як след, пройдзе фестываль хмелю і соладу.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Спытайце пра радзіннае

Чым абсыпаць маладых на вяселлі?

На розных сустрэчах і з людьмі сталага ўзросту, і з моладдзю раз-пораз гучыць пытанне: «Чым трэба абсыпаць маладых на вяселлі?» Адказваем: «Жытам!» Тады ўслед гучаць розныя супярэчлівыя ўдакладненні. Нехта скажа: «Адсталі вы ад жыцця, трэба абсыпаць рысам, бо так робяць кітайцы». «Не, — нехта не пагаджаецца: пялёсткамі руж, дарагавата, але чаго не зробіш для любімага дзіцяці». «Што вы, цяпер модна абсыпаць маладых канфеці (кавалачкамі рознакаляровай бліскучай паперы)». Ну вось і што тут скажаш. Колькі людзей, столькі і меркаванняў.

У вусна-паэтычнай спадчыне беларусаў даволі шырока прадстаўлены злакавыя культуры, сярод якіх важнае месца займае жыта. Сучаснаму чалавеку ў большай ступені знаёмы рытуал абсыпання зернем жыта вясельнага поезда перад адпраўленнем у храм, пазней у загс. Украінскі даследчык М.Ф. Сумцоў адзначае: «Абрадавае ўжыванне хлебных зярнят асабліва распаўсюджана на вяселлях усіх славян, больш за тое, усіх індаеўрапейскіх народаў. Гэта настолькі важны акт вясельнага рытуалу, што без яго ні велікарусы, ні беларусы не здзяйсняюць шлюбнай бяседы; відаць, ніводны індаеўрапейскі народ не прызнае ці не прызнаваў даўней вяселле скончаным без абсыпання маладых хлебнымі зярнятамі». Далей даследчык удакладняе, што ў розных народаў абрад абсыпання маладых праводзілі ў розны час, у розных месцах і рознымі злакавымі культурамі, а таксама цукеркамі, арэхамі і да т. п.

Такім чынам, па народных уяўленнях зерне, незалежна ад злакавай культуры, першым чынам з'яўлялася цэнтрам жыццёвай сілы, знакам урадлівасці, адраджэння, неўміручасці, вечнага абнаўлення, лічылася зародкам новага жыцця.

Зерне, колькасць якога немагчыма злічыць, выступала знакам множнасці, а значыць, багацця. А таму практычна ва ўсіх каляндарных і сямейна-родавых абрадах прысутнасць зерня была абавязковая. Рытуальнай сяўбой — «засеўкамі» — пачыналі новы год. Насенне ўсіх традыцыйных для Беларусі культур (жыта, аўса, ячменю, пшаніцы, проса) было асноўным абрадавым атрыбутам у кантэксце калядна-навагодняга абраду «засявання», які выконваўся дзецьмі раніцай 14 студзеня, г. зн. адразу ж пасля святкавання Шчадраца. Зерне гэтых жа культур выкарыстоўвалі падчас абрадавых падзей абыходу вёскі ў дзень Багача, свята ў гонар завяршэння збору ўраджаю, прымеркаванага да часу восеньскага раўнадзенства. Заўважце: і ў адным, і ў другім выпадку было задзейнічана зерне культур, якія складалі аснову дабрабыту сям'і. Таму далёка не выпадковая сувязь з тымі беларускімі святамі, у назве якіх сфакусіравана філасофія ўсяго цыклу гаспадарчай дзейнасці чалавека-земляроба быць багатым — Шчодры вечар (14.01) і Багач (21.09).

«Сама прысутнасць зерня на святочным стале (і ўсякага кшталту кантакт з ім) забяспечвала хаце дастатак, урадлівасць і агульны дабрабыт», — сцвярджае расійская даследчыца В. У. Усачова. А таму, перад тым як маладыя надзявалі заручальныя пярсцёнкі, іх на некаторы час клалі ў жыта. Менавіта так робяць сёння ў некаторых загсах Беларусі.

Зерне надзялялася не толькі прадукавальнай, але яшчэ і ахоўнай семантыкай. І калі бацькі абсыпалі маладых зернем адной са злакавых культур, яны жадалі ім сямейнага дабрабыту, нараджэння дзяцей, а таксама імкнуліся абараніць ад уздзеяння злых сіл.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

«ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ» Ў ВЁСЦЫ Н.

...Тая вёска, можна сказаць, у стане знікнення: хат пустых куды болей, чым жыхароў, дакладней — жыхарак, бо мужчын толькі трое: Іван, Яўхім і глухі дзед Макар. У першага ёсць жонка, у апошняга — была, ды, на жаль, памерла. А вось «сярэдні», Яўхім, з'ездзіў неяк у сваты, ды, відаць, не спадабаўся дзяўчыне — нагрузіла цэлы воз гарбузоў. Што азначала адмову, прычым адмову ганебную... Пасля такой — не ўсякі ажэніцца. Вось і Яўхім і жыў, і жыве адзін. Кватарантаў, праўда, час ад часу трымае. Не так даўно ў яго тапографы спыняліся — маладыя, вясёлыя хлопцы. Добра ім было: прасторная чыстая хата, дармавая садавіна ды гародніна, гасцінны гаспадар... Адзінокі, шкада.

А таму, відаць, не дзіва, што пасля ад'езду яны яму пасылку прыслалі.

...На распакоўку Яўхім паклікаў Івана. Бачаць: нешта ружовае... Як быццам гумовае... Дык дзеўка ж! І помпа пры ёй.

На дварэ дзядзькі паслалі радзюжку, напампавалі паветрам «цела» той маладзіцы, памацюкаліся, парагаталі яшчэ, пашукалі, чым бы адтуліну заткнуць? У пасылцы нічога не знайшлі. Яўхім у хату збегаў — вынес моцныя ніткі, злажылі ў сем столак, завязалі, як быццам, а вось падумаць, што далей рабіць, — не паспелі: дождж стаў находзіць, а ў Івана сена ў полі, у Яўхіма — яблыкі на сонцы. Пакуль спяшаліся-ратавалі ўсё, грымнуў гром — усчалася такая навальніца...

Не да дзевак было.

...Калі на вуліцы сціхла і ў двор Яўхіма вярнулася сонейка — ні радзюжкі, ні той ружовай маладзіцы ўжо не было. «Бурай знесла», — вырашылі дзядзькі і з палёгкай уздыхнулі, бо адна справа, калі баба жывая, а вось з гэтай лялькай — што ты будзеш рабіць?..

Як аказалася — нешта... трэба, бо нараніцу Іван убачыў яе побач з хатай: прыгажуня лёгенька гайдалася на высокай ліпе.

— Добра было б сцягнуць яе, пакуль бабы не згледзелі, — прапанаваў Іван суседу.

— Але ж як?

Пакуль абодва чухалі патыліцы, вуліца стала пакрысе ажываць, напаўняцца жыхарамі. Яны згледзелі неяк дзеўку і пыталі, адкуль гэты цуд? Яўхім, вядома ж, маўчаў. Добра, што Кацярына, жонка Івана, знайшлася. Сказала:

— Мусіць, навальніцай прынесла.

Тым часам з райцэнтра прыехала маршрутка і спынілася не на плошчы, а бліжэй да «натоўпу», бо цікава ж, чаго людзі пасталі — угору глядзяць... Дык жа маюць на што.

І, як здалося нейкім балбесам: ногі ў дзявулі доўгія, грудзі вялізныя, губы чырвоныя... Ну і ўсё астатняе таксама пры ёй...

Некаму сфатаграфаваць захацелася, некаму парагатаць, парасказваць анекдоты. Спрытная баба Жураўліха падмітусілася — прапанавала расказчыкам купіць клубніцы, якія збіралася везці ў горад... Ягады разышліся ўмомант.

На наступны дзень маршрутка прыехала зноў — прычым поўная зявак-турыстаў.

Таму жанчыны, натхніўшыся поспехам Жураўліхі, панеслі пад ліпу яшчэ гарачыя кукурузныя пачаткі, слоікі з казіным малаком, зялёную цыбулю, сала... Усё тут ішло «на ўра».

...Ці ведалі вяскоўцы сапраўднае прызначэнне лялькі, я сказаць не бяруся. А вось прыезджыя — тыя дакладна ведалі і нават глухому дзеду неяк давялі. Таму ён раз-пораз падыходзіў да турыстаў і казаў ім адно і тое ж:

— Бач, дайшла цывілізацыя. І мы ўжо секс-шопу маем!

Шкада, што нядоўга яна пабыла. У канцы месяца надвор'е зусім сапсавалася, некалькі дзён запар аб'яўлялі так званы аранжавы ўзровень, пасля якога ліпа... апусцела. Куды тую дзеўку занесла, ніхто не ведае.

На ўсякі выпадак задзярыце галаву, паглядзіце ўверх на дрэвы. Можа, яна дзе ў вас?

Н. А.,
г. Петрыкаў.

ТАНЕЦ З... КВЕТКАМІ

Жыццё — гэта, згадзіцеся, чаканне вясны, перажыванне вясны і ўспамін пра яе...

У нас насупраць дома расце прыгажуня груша. А ўжо як зацвіце!..

Кветка ў яе — найпрыгажэйшая! Пасярэдзіне — сонечная зорачка і прамяньчыкі-тычынкі, па краях — белыя шырокія пялёсткі. Пчолка на такіх — як на жывой пярынцы сядзіць...

А неяк, бачу, птах на галінцы з'явіўся. Голуб не голуб, бо за яго буйнейшы... І апярэнне папялістае, а дзюба ружовая, (не шэрая, як у звычайных гарадскіх галубоў). Ды на шыйцы яшчэ два светла-жоўтыя паўмесяцы...

А галоўнае, што паводзіны зусім нязвыклыя. Вакол ігрушы — мітусня ды рух: скачуць жвавыя вераб'і і галкі-хутканожкі, сварацца за нешта навасёлы-шпакі, штось шукае ў траве чырванавокі грак, топчуцца важныя вароны... Карацей — віруе жыццё! А вось гэты незнаёмы птах сядзіць нібы ў роздуме... Ці ў чаканні?

Ага, так і ёсць: да яго, на тую ж галінку, планіруе крылатая сяброўка. Яе кавалер, як можна зразумець, прыляцеў першы — праверыў месца...

Цікава стала, хто ж ён такі?

Інтэрнэт падказаў: вяхір, лясны голуб. Там жа я прачытаў, што колькасць гэтых птушак паступова скарачаецца — з-за высечкі лясоў і празмернага... адстрэлу. Дык вось чаму яны апынуліся ў горадзе: у нас, людзей, шукаюць паратунку і пры гэтым...

Цуд дый годзе: той кавалер, гляджу, сарваў з грушы кветку, з ёй жывым самалёцікам пераляцеў на іншую галінку (за нейкі метр ад сваёй прыгажуні) і распачаў там сапраўдны канцэрт: з хлопаннем крыламі, з перабіраннем лапкамі...

Пра шлюбныя танцы я нешта недзе чытаў, але ж каб з кветкай у дзюбе... Шкада — фотаапарата пад рукой не было!

...Але ж вось «выступленне» скончана, пара галубоў уздымаецца з грушы, пералятае (кветка — з імі) на іншае дрэва — і зусім не выпадковае. Каля нашага дома сто гадоў ужо елка расце — густая-густая. Якраз такая закаханым, відаць, і патрэбна! Парачка хаваецца ў ёй, прычым так, што яе ніхто там не знойдзе і не дабярэцца. Нават кот пашкадуе лапак сваіх — не палезе ў калючы хвойнік. Значыць, вось яно, месцейка для гнязда, для птушынага дома, «падлогу» ў якім і напраўду разумна ўсцілаць кветкамі, бо птушанятам павінна ж быць цёпла!

...Цяпер на дварэ ліпень, і парачка тых галубоў разам з нашчадкамі ўжо адляцела ад нашага дома. Ім наўздагон хочацца сказаць шчыры дзякуй за чаканне вясны, перажыванне вясны і ўспамін пра вясну.

Юрый Паталкоў,
г. Брэст.

НОЧ АД'ЕЗДУ І НОЧ ПРЫЕЗДУ

Зімой мне гэта гісторыя таксама ўспамінаецца, але ж неяк радзей, а вось калі пачынае цяплець...

У той год нашы дзеці (зяць з дачкою) вырашылі падарыць нам... адпачынак, прычым сапраўдны і, можна сказаць, першы за ўсё жыццё, бо мы з мужам сапраўды ніколі не бачылі мора (апроч нашага, Мінскага), не былі далёка за межамі, не ляталі на самалётах.

Без гэтага — неяк жылі...

І маглі б жыць далей, аднак дзеці сталі даводзіць, што нам абаім — даўно не па сорак, што праца і лецішча нідзе не дзенуцца, што трэба падумаць пра здароўе ды пра тое, каб хоць трохі ўбачыць свет...

Але ж галоўнае нават не гэта: мы збіраліся ехаць разам, усёй сям'ёй, дзеці бралі з сабой нашу ўнучку, і панянькацца з ёй на беразе мора... Што можа быць лепей?!

Карацей, мы ўрэшце згадзіліся. А ўсе клопаты — па афармленні віз, браніраванні жылля, білетаў на самалёт і г. д. — зяць узяў на сябе, прычым яшчэ ў снежні, здаецца... Казаў, што так будзе танней.

І вось ён, дзень (а калі дакладней — то ноч) нашага ад'езду. Мы з мужам загадзя сабраліся, спакавалі чамаданы, у прызначаны час чакаем дзяцей, каб разам з імі паехаць у Варшаву (пералёт адтуль, казалі, ці не ўтрая таннейшы, чым з Мінска)... А яны — чамусьці не едуць: пазванілі адзін раз — сказалі, што затрымаюцца, потым пазванілі другі...

Пасля трэцяга званка бацька ўжо пытаўся, ці не зрабілася што? Ці здаровыя? Дачка супакойвала: усё дзякуй богу. Але ж можа (?!) так стацца, што... яны нікуды не паедуць (?!)...

«Не паедзеце вы, дык і мы не паедзем, — згадзіўся бацька. — Не вельмі нам і хацелася. На лецішчы пабудзем».

Такім чынам, я ўжо збіралася разбіраць чамаданы, калі «ўлада» рэзка змянілася: дзеці сказалі, што яны такі выязджаюць...

Пасля гэтага званка была сустрэча і досыць доўгая дарога: некалькі гадзін на мытні, цудоўны дзень у Варшаве, цікавы пералёт, і нарэшце — сустрэча з морам! Дзіва-дзіўнае, але варта было яго ўбачыць, зайсці ў мяккую цёплую вадзіцу, і стому як рукою зняло! Мы такі прыехалі — адпачываць!

...У той, самы першы наш вечар малая доўга не спала. Зяць з дачкою былі пры ёй. Мы з мужам — збіралі на стол. І накрывалі яго на прасторнай адкрытай верандзе з відам на мора.

Вельмі доўга потым сядзелі там, нешта елі-пілі, доўга размаўлялі, успаміналі дарогу. І пачулі ад дзяцей, што пачалася яна з вялікай згубы: то-бок перад самым ад'ездам у іх з кватэры прапалі... замежныя пашпарты, без якіх, вядома ж, ні за якую мяжу не выедзеш...

А таму іх шукалі ўсюды — у сумках і адзенні, у сталах і шафах (у дзяцей вялікая бібліятэка), у кухні, на балконах, нават на дварэ... у кантэйнерах для смецця (зяць яго разграбаў лыжнай палкай, а дачка ліхтарыкам свяціла).

Шукалі яшчэ ў ванным пакоі і непасрэдна пад ваннай. Там ужо — казалі — з істэрычным рогатам, бо хацелі, як у таго ашмянскага мытніка, знайсці два мільёны долараў і папрасіць, каб самалёт ім падагналі да пад'езда...

А ўрэшце, страціўшы ўсялякую надзею, сталі яшчэ раз абмацваць пасцель пад бокам у дзіцяці, якое ўвесь гэты час вельмі соладка спала. І хоць-нехаць пабудзілі яго. І маці «на аўтапілоце», можна сказаць, папыталася:

— Дачушка, ты не бачыла трох маленькіх сіненькіх кніжачак — у таты на пісьмовым стале?

Малая ўсміхнулася, кулачкамі працерла вочкі, узяла бацьку за любімы палец — патэпала ў бок ванны.

— Там, — паказала пальчыкам на дзверцы пральнай машыны.

Зяць адчыніў іх, засунуў руку і... з-пад нейкіх адзежак дастаў тры маленькія сінія кніжачкі.

— Гэта ты іх схавала? — спыталі бацькі ў дачушкі.

— Я, — задаволена кіўнула яна.

...Больш чым два тыдні мы пражылі тады нібы ў казцы: чысцюткае паветра, сонца, мора, паездкі-экскурсіі, дзівосная прыгажосць, а ўжо кампанія...

І ўсё ж самы светлы ўспамін — пра той, самы першы наш вечар, калі ўнучка соладка спала, а мы, учатырох, сядзелі за сталом, дыхалі морам і да слёз рагаталі, слухаючы, што адбылося з яе «падачы».

Л. Сенька,
г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Zамор'е

На дапамогу братам па розуме

У ЗША вырашылі штурмаваць ваенную базу ў пошуках іншапланецян.



Амаль паўмільёна карыстальнікаў Facebook выказалі жаданне ўварвацца на тэрыторыю базы «Зона 51» у амерыканскім штаце Невада і знайсці там іншапланецян. Усе яны адзначыліся ў адпаведнай жартоўнай групе мерапрыемства. Яшчэ 450 тысяч чалавек падпісаліся на абнаўленні супольнасці.

Мерапрыемства, датаванае 20 верасня, названа «Штурм «Зоны 51». Яны не змогуць нас усіх спыніць». Згодна з яго апісаннем, карыстальнікам прапануюць сустрэцца ў турыстычным цэнтры непадалёк ад базы і зайсці на аб'ект. «Калі мы пабяжым, то зможам рухацца хутчэй за іх кулі. Давайце паглядзім на прышэльцаў», — заклікалі арганізатары. Многія карыстальнікі распрацавалі ўласныя планы захопу і стварылі сотні мемаў на гэтую тэму. Напрыклад, адзін з іх прапанаваў раздражніць «супраціўленне», кідаючы ў іх камяні. Некаторыя каментатары, не зразумеўшы сарказму, выказалі здагадку, што ўсіх наведвальнікаў базы расстраляюць на месцы.

Склеенаму верыць

Жанчына выпадкова здрабніла грошы ў шрэдары і больш за месяц склейвала іх.

Жыхарка Паўднёвай Карэі памылкова сунула банкноты ў шрэдар, аднак здолела іх аднавіць і памяняць у банку, паведамляе інфармацыйны партал Asia One. У чэрвені жанчына выпадкова паклала канверт, у якім было 11 банкнотаў па 50 тысяч вонаў, у офісны шрэдар. Перш чым яна ўсвядоміла сваю памылку, прылада, вядома, зрабіла тое, для чаго і была створана, — здрабніла купюры. Карэянка ў роспачы папрасіла аб дапамозе карыстальнікаў інтэрнэту. Ёй расказалі, што банк прымае і абменьвае толькі фрагменты банкнот, якія маюць памер не меншы за 80 % ад арыгінальнай плошчы.

На працягу месяца жанчына марнавала ўвесь вольны час на тое, каб склеіць купюры, ёй дапамагалі муж і дачка. Банк прыняў сабраныя з дробных кавалачкаў купюры і абмяняў іх на новыя. Упартасць жанчыны захапіла яе начальніка, у якасці заахвочвання ён пачаставаў яе абедам. Аповед жанчыны распаўсюдзіўся па сацыяльных сетках. Каментатараў захапіла ўседлівасць і мэтанакіраванасць карэянкі. «Гэтая жанчына можа расследаваць справы ў паліцыі, калі ёй удалося склеіць гэтыя банкноты», — напісаў адзін з карыстальнікаў.

Рамантуеш сваю машыну? Плаці штраф!

У ЗША аўтаўладальнікам забаранілі заглядваць пад капот сваіх аўто. Гаворка ідзе пра рамонтныя работы, якія гаспадары машын хочуць праводзіць сваімі сіламі ў сваім гаражы.

У розных штатах ЗША законы адрозніваюцца, і сярод іх нямала такіх нормаў, якія выклікаюць усмешку або здзіўленне. Да ліку апошніх належыць новая забарона, якая з'явілася ў штаце Каліфорнія, акруга Сакрамэнта. Там уладальнікам забаранілі самастойна рамантаваць свае машыны.

Мясцовы закон ставіць пад забарону работу з аўтамабілямі, што належаць асобам, якія пражываюць па тым адрасе, дзе рамантуюць машыну. Нельга рамантаваць тэхніку з выкарыстаннем інструментаў, якія не адносяцца да ліку бытавых, а таксама нельга праводзіць такія маніпуляцыі з транспартнымі сродкамі, якія абезрухоўліваюць іх на 24 гадзіны і больш. Пры гэтым змяняць масла і фільтры, абслугоўваць тармазы, рамантаваць покрыўкі і праводзіць іншыя дробныя аперацыі ў Сакрамэнта па-ранейшаму дазваляецца. Сваю забарону ўлады растлумачылі імкненнем абараніць навакольнае асяроддзе ад забруджвання гаручазмазачнымі матэрыяламі і іншай хіміяй. Любога, каго паліцыя зловіць на парушэнні новых правілаў, чакае штраф у 430 долараў.

Іван КУПАРВАС.

ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом повторном аукционе по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г. Кобрине Брестской области 2 августа 2019 года в 11.00

№ лота	Адрес земельного участка	Целевое назначение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.	Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.
1.	г. Кобрин, ул. Чапаева, 2	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки)	124350100001007645	0,1018	Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения	22604,10	2260,41	1455,42*
2.	г. Кобрин, ул. Чапаева, 8	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки)	124350100001007648	0,1019	Обеспеченность (возможность) подключения газоснабжения, электроснабжения, водоснабжения	22626,30	2262,63	1374,10*

Дополнительно возмещаются расходы на публикацию извещения в СМИ.

Организатор аукционов – Кобринский районный исполнительный комитет.

Аукцион состоится 2 августа 2019 года в 11.00 по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний 1-й этаж.

Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.

Последний день приема заявлений – 29 июля 2019 г. до 13.00. Тел. для справок 8 (01642) 2-28-11, 2-32-82.

Продажа земельных участков осуществляется гражданам Республики Беларусь.

К участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в установленный в извещении срок, предоставившие документ о внесении суммы задатка (задатков) и заключившие с Кобринским райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам не возмещаются.

Более подробная информация об условиях проведения аукциона размещена на сайте http://kobrin.brest-region/gov.by

УНП 200042468

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор электронных торгов: Новопольский сельский исполнительный комитет, 222845, Минская область, Пуховичский район, Новопольский сельсовет, аг. Новополье, ул. Центральная, 21, тел. +375 17 133 03 16, 133 03 35

Оператор электронной торговой площадки: ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

Торги проводятся 20.08.2019 на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by. Время торгов устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

№ лота	Местонахождение земельного участка; кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб.
	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.02	21.29	16.27
Віцебск —	4.44	21.26	16.42
Магілёў —	4.52	21.19	16.27
Гомель —	4.57	21.08	16.11
Гродна —	5.19	21.43	16.24
Брэст —	5.27	21.35	16.08

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Антона, Валянціна, Васіля, Інакенція, Лук'яна, Сідара, Сысоя, Фёдара.*
К. *Макрыны, Вінцэнта, Марціна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Раўнівая жонка прачытала паведамленні мужа ў «Фэйсбуку» і лайкнула яго патэльняй.

— Вой, і за што майму сыночку такая жонка дасталася?!

— Ды за вашы грахі, мама!..

Цэлы месяц Аксана вучыла правілы дарожнага руху, а калі выехала ў горад, зразумела, што лепш бы вучыла малітвы.

— У інстытут паступіў?

— Не, па конкурсе не прайшоў.

— А конкурс быў вялікі?

— 5 тысяч у. а.

Бацькі з дзяцінства прывучалі мяне да музыкі: практычна кожны дзень яны прасілі выканаць марш «У свой пакой».

— Прывітанне, мяне завуць Васіль, і я скраў панду з заапарка.

— У нас, ведаеце, клуб ананімных алкаголікаў.

— А вы думаеце, я гэта цвярозы зрабіў?

— Прывітанне, Васіль.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2344.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 ліпеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

19 ліпеня 2019 г. № 29 (514)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Фота БелТА.

НА КАРЫСЦЬ КРАІН-СУСЕДАК

Прыярытэты развіцця Саюзнай дзяржавы гэтымі днямі былі ў цэнтры ўвагі палітыкаў, экспертаў ды наогул усёй грамадзянскай супольнасці Беларусі і Расіі

На працягу чатырох дзён — з 15 да 18 ліпеня — у Санкт-Пецярбургу праходзіў VI Форум рэгіёнаў, сёлетняя асаблівасць якога ў шырокім і адмысловым удзеле моладзі. Менавіта з VII Расійска-беларускага маладзёжнага форуму «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» і стартавала маштабнае мерапрыемства, на наступны дзень адбылося пасяджэнне Савета Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Пасля гэтага — 17 ліпеня — моладзь брала ўдзел у экспертнай сесіі, прысвечанай прыярытэтам развіцця Саюзнай дзяржавы.

Падчас асноўных мерапрыемстваў чарговага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў былі пытанні фарміравання агульнай адукацыйнай, інфармацыйнай прасторы, культурна-гуманітарныя праекты, супрацоўніцтва рэгіёнаў і іншыя тэмы. На форуме, між іншым, былі падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі дзвюх краін, камерцыйныя кантракты, іншыя дакументы аб супрацоўніцтве.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 2—3

Агульны інтарэс

Моладзь Беларусі і Расіі мае намер больш актыўна ствараць сумесныя бізнес-інкубатары

Удзельнікі VII Маладзёжнага форуму Расіі і Беларусі «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» маюць намер больш актыўна падтрымліваць маладзёжныя прадпрымальніцкія ініцыятывы за кошт стварэння бізнес-інкубатараў. Аб гэтым гаворыцца ў рэзалюцыі форуму, паведамляе БелТА.

Прапануецца таксама пашыраць практыку расійска-беларускіх студэнцкіх атрадаў рознай накіраванасці, садзейнічаць рэалізацыі сумесных экалагічных, турыстычных, валанцёрскіх праектаў.

Актыўны ўдзел моладзі ў працэсе абмеркавання сучаснасці і будучыні краін — залог устойлівасці і паслядоўнасці іх развіцця, падкрэсліваецца ў рэзалюцыі. «Удзельнікі VII Маладзёжнага форуму Расіі і Беларусі лічаць важным працягваць развіваць добрасуседскае супрацоўніцтва, пашыраць спектр зносін і дзелавых сувязяў паміж краінамі, кансалідаваць намаганні па ажыццяўленні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Расіі і Беларусі, адзначаючы агульную зацікаўленасць у развіцці міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва», — сказана ў дакументе. У ім таксама акрэслена імкненне рэалізоўваць сумесныя мерапрыемствы і праекты ва ўсіх сферах жыцця грамадства, знаходзіць новыя формы дыялогу і супрацоўніцтва паміж маладымі людзьмі з рознымі прафесійнымі і сацыяльнымі інтарэсамі.

Акрамя таго, моладзь мае намер засяродзіцца на двухбаковых праектах, накіраваных на ўмацаванне дружбы і супрацоўніцтва, аддаць асаблівую ўвагу захаванню памяці аб Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.



Фота БелТА.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Крок за крокам

Беларусь і Расія зблізілі пазіцыі па праграме рэалізацыі дагавора аб Саюзнай дзяржаве. стар. 2

І пуста, і густа

Як развіваецца сацыяльная інфраструктура маладых мікрараёнаў? стар. 4

Садок-трансформер

Новую канцэпцыю вядомай ідэі рэалізавалі ў Гомелі. стар. 4, 13

У зоне дасягальнасці

«МС» высветліла, наколькі падрыхтаваныя для навасёлаў новыя кварталы Магілёва. стар. 14

Самы чысты райцэнтр

За што Мядзел атрымаў такі ганаровы статус? стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Чым жывуць завадчане

Адбылася рабочая сустрэча Міхаіла Мясніковіча ў Заводскім раёне Мінска

Старшыня Савета Рэспублікі на мінулым тыдні наведаў Мінскі падшыпнікавы завод, Завод зборных жалезабетонных канструкцый, правёў сустрэчу з актывам і прыём грамадзян у Заводскім раёне сталіцы.

— Канешне, ёсць пытанні, якія трэба было б больш актыўна, на маю думку, вырашаць і ў раёне, і ў горадзе. Размова ідзе і аб прамысловых прадпрыемствах. І тут ёсць дакладная ўстаноўка кіраўніка дзяржавы, што ўсе прадпрыемствы (прамысловыя, будаўнічыя) павінны мець свае планы перспектыўнага развіцця. І абарона гэтых планаў павінна быць не фармальнай, а наадварот — скрупулёзнай работай для раённых і гарадскіх улад. Можна дзесьці знайсці гэтыя вузкія месцы, дапамагчы ім разабрацца ў тых ці іншых пытаннях. У гэтым, безумоўна, павінна быць зацікаўлена мясцовая адміністрацыя, — адзначыў спікер Савета Рэспублікі.

Пра фінансава-эканамічную дзейнасць свайго прадпрыемства Міхаілу Мясніковічу расказаў генеральны дырэктар ААТ «Мінскі падшыпнікавы завод» Мікалай Анціпаў. Завод заканчвае праграму тэхнічнага пераабсталявання, якая была запушчана ў 2009 годзе. Самае вялікае ўкладанне прадпрыемства — кольцараскатны комплекс. Сёння колькасць работнікаў прадпрыемства складае амаль 1800 чалавек. Да 77 % выпускаемай заводам прадукцыі пастаўляецца на экспарт. Асноўны партнёр — Расія, расце доля Украіны. Да 9 % дасягнулі аб'ёмы закупак з краін далёкага замежжа.

sovrep.gov.by

— Радуе, што большасць прамысловых прадпрыемстваў — на пад'ёме. І ў гэтай сітуацыі ажываюць рынкі, якія былі праблемнымі. Напрыклад, на падшыпнікавым заводзе мы разглядалі шэраг пытанняў. Абнадзейвае тое, што ў іх могуць быць вельмі добрыя, цікавыя кантракты з Індыяй, з шэрагам іншых краін далёкага замежжа. Дыверсіфікацыя экспартных патокаў — гэта добра, — упэўнены Міхаіл Мясніковіч.

На сустрэчу з кіраўніком Савета Рэспублікі ў Адміністрацыю Заводскага раёна запрасілі дэпутатаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, адукацыйных устаноў, грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый.

Сёння колькасць жыхароў гэтай часткі Мінска складае 237 тысяч чалавек. У раёне размяшчаюцца 44 буйныя прадпрыемствы прамысловасці: «Мінскі аўтамабільны завод», «Мінскі падшыпнікавы завод», «Мінскі завод колавых цягачоў», «Завод аўтамабільных прычэпаў і кузаваў «МАЗ-Купава», «Мінскжалезабетон» і іншыя. За студзень — май 2019 года аб'ём прамысловай вытворчасці ў раёне склаў больш за мільярд рублёў.

— Кожны раён мае моцныя і слабыя бакі. У Заводскім раёне моцныя бакі — гэта прамысловы і экспартны патэнцыял. Раён з'яўляецца адным з найбуйнейшых не толькі ў Мінску, але і ў краіне па аб'ёмах прамысловай вытворчасці. Колькасць працоўных, занятых у эканоміцы раёна, складае больш за 62 тысячы чалавек, — паведаміў першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Заводскага раёна Мікалай Палякоў.

Падчас размовы з актывам акцэнтавалі ўвагу на шматлікіх пытаннях — пазашкольнай адукацыі дзяцей і падлеткаў, правапарадку, аховы здароўя, занятасці насельніцтва, работы з прызыўнікамі. Асабліва актуальныя, як заўсёды, пытанні сферы будаўніцтва. Так, Міхаіл Мясніковіч параіў павялічваць аб'ёмы ўзвядзення камерцыйных кватэр, пашыраць будаўніцтва арэнднага жылля.

— Будаўнікі дастаткова ўпэўнена сябе адчуваюць. І ўсе пытанні, з якімі звярталася да мяне кіраўніцтва аб'яднання «Мінскпрамбуд», — вырашальныя. Ёсць, канешне, мясцовыя няўвязкі. У тым ліку трэба, каб больш работы было і на ўнутраным рынку, пры ўсёй павазе да пашырэння экспарту будаўнічых паслуг, — выказаў меркаванне спікер верхняй палаты парламента.

Гэтае ж сталічнае прадпрыемства якаснай, тэрміновай работай зарэкамендавала сябе ў рэгіёнах Расіі. «Мінскпрамбуд» працуе ў Беларусі на аб'ектах «Слаўкалія» ў Любані, Петрыкаве, на будаўніцтве завода вырабаў з белай бляхі ў Віцебскай вобласці.

— Калі кажуць, што самыя лепшыя будаўнікі з'ехалі і нікога тут не засталося, — гэта не адпавядае рэчаіснасці. Ствараюцца адпаведныя ўмовы для таго, каб павышаць кваліфікацыю. Я задаваў пытанні, глыбока цікавіўся гэтай тэмай. У чым поспехі нашых некаторых будаўнічых арганізацый? Яны маюць цесныя кантакты з нашымі ўніверсітэтамі: на гэтай стадыі яны пачынаюць адбіраць сабе спецыялістаў. І потым: у іх ёсць свае вучэбныя камбінаты, дзе яны зыходзячы са спецыфікі сваёй арганізацыі павышаюць кваліфікацыю людзей, — растлумачыў Міхаіл Мясніковіч.

Марыя ДАДАЛКА.

«Форум регионов прирастает новыми

Выступление председателя Совета Республики Национального

Глубокоуважаемая Валентина Ивановна!

Уважаемые участники форума!

Высокое собрание!

От имени Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь хочу поблагодарить Совет Федерации Федерального собрания Российской Федерации, лично вас, уважаемая Валентина Ивановна, за высокий уровень организации работы форума, интересную и насыщенную программу. Большое спасибо руководителям регионов Беларуси и России за участие в форуме. Это, как говорится, дорого стоит.

Мы признательны Президенту Республики Беларусь Александру Григорьевичу Лукашенко и Президенту Российской Федерации Владимиру Владимировичу Путину за их регулярное участие в работе Форума регионов. Для организаторов и участников это огромная честь и ответственность.

С каждым годом Форум регионов Беларуси и России прирастает новыми проектами, соглашениями и коммерческими контрактами. Это свидетельство того, что проект состоялся, в него верят и он не исчерпал свой потенциал.

В чем новизна VI Форума? Впервые широко охватывается гуманитарная тематика: образование, культура, туризм, медиасфера. Но главное, пожалуй, молодежная политика. Россия — великая страна, и мы дорожим нашей дружбой. Эти святые дружеские отношения важно передать молодому поколению.

Фота БелТА.

У молодежи наших стран амбициозные и актуальные запросы и нам, парламентариям, региональным властям, надо своими действиями соответствовать этим высоким требованиям. Давайте возьмем за правило, чтобы, например, во время взаимных визитов в составе региональных делегаций были представители молодежи: вузовской, рабочей, из интеллигенции, чтобы эти вопросы были постоянно в повестке парламентов, интеграционных структур. Нужно в целом придать динамизм белорусско-российскому молодежному сотрудничеству. Ряд интересных предложений вошел в итоговый документ форума. О некоторых совместных подходах по работе с креативной молодежью мы договорились с Валентиной Ивановной.

Беларусь и Россия активно обсуждают новую программу действий по реализации положений договора о создании Союзного государства. Нормы договора прошли проверку временем и доказали свою состоятельность. Они не потеряли актуальность и дополняются новыми положениями Программы действий. Но не следует замалчивать недостатки. Серьезный вопрос — это порядок принятия и исполнения решений, затрагивающих интересы союзного партнера. Большинство барьеров именно из-за этого. Постоянному комитету Союзного государства можно было бы проанализировать этот вопрос и доложить на очередном заседании Высшего госсовета.

Не могу не назвать такую проблему, как маркировка товаров средствами идентификации. Если не будет решения о взаимном признании национальных систем и единого порядка информационного обеспечения, рынки ЕАЭС и Союзного государства могут быть парализованы. Тема обсуждалась не один раз. Просьба к правительству

Фота БелТА.

КРОК ЗА КРОКАМ

Аб гэтым заявіў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы са старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай МАЦВІЕНКА.

У VI Форуме рэгіёнаў удзельнічалі вялікія групы, якія прадстаўлялі інтарэсы ўрадаў. У цэнтры іх увагі знаходзіліся пытанні, якія датычацца ў першую чаргу «напаўнення саюзнага дагавора праз абноўленую актуалізаваную праграму дзеянняў». Спікер верхняй палаты беларускага парламента на сустрэчы са сваёй расійскай калегай адзначыў, што адпаведныя рабочыя групы фактычна зблізілі шмат у чым пазіцыі.

Абноўленую праграму дзеянняў Міхаіл Мясніковіч ахарактарызаваў як сучасны дакумент. «Рэалізаваць яго без удзелу парламентарыяў будзе дастаткова складана, таму што чырвонай ніткай праходзяць пытанні, звязаныя з уніфікацыяй і гарманізацыяй заканадаўстваў дзвюх краін», — лічыць старшыня Савета Рэспублікі. Збліжэнне заканадаўстваў неабходнае, каб здымаць існуючыя бар'еры і не дапускаць іх стварэння ў далейшым, дадаў ён.

У сваю чаргу, старшыня Савета Федэрацыі Валянціна Мацвіенка адзначыла, што рэалізацыю дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы важна напаўняць актуальнымі праектамі.

Яна звярнула ўвагу на тое, што сёлета адзначаецца 20-годдзе з моманту падпісання саюзнага дагавора — гэта добры час для асэнсавання пройдзенага шляху. Паводле яе слоў, важна прадумаць, як напоўніць дакумент новым зместам, праектамі, якія адлюстроўваюць рэаліі, каб дагавор адпавядаў новым выклікам і магчымасцям.

Яна дадала, што аналіз зробленага за 20 гадоў існавання Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі паказвае: для паглыблення вытворчай эканамічнай кааперацыі, эканамічнага супрацоўніцтва патрэбны і сінхранізаваныя крокі па прывядзенні заканадаўства ў адпаведнасць з новымі патрабаваннямі. Гаворка ў нейкай меры ідзе аб яго ўніфікацыі, каб бізнес ведаў агульныя правілы гульні і разам з парламентарыямі здымаў існуючыя перашкоды, растлумачыла спікер. «У гэтым сэнсе заканадаўцы могуць унесці свой важкі ўнёсак», — упэўнена Валянціна Мацвіенка.

Тон двухбаковым адносінам задаюць кіраўнікі дзяржаў, яны вызначаюць парадак развіцця інтэграцыйных працэсаў, падкрэсліла спікер. Яна адзначыла,

Беларуси и России проектами и не исчерпал свой потенциал»

собрания Республики Беларусь Михаила МЯСНИКОВИЧА на пленарном заседании VI Форума регионов

Российской Федерации принять решение с учетом мнения партнеров по ЕАЭС.

Продолжают действовать ограничительные меры в отношении отдельных белорусских производителей продовольствия, несмотря на разработанные «дорожные карты» по снятию взаимных ограничений.

Системное регулирование этих и других вопросов заключается в необходимости гармонизации и унификации национальных законодательств и правоприменительной практики. Решение этих задач должна обеспечить концепция сближения законодательства. Однако ее подготовка неоправданно затягивается. Это сфера ответственности Постоянного комитета Союзного государства и Парламентского собрания. Белорусская сторона в течение 2018 года вносила свои предложения.

На пути формирования единого экономического пространства наши страны сделали немало серьезных шагов навстречу друг другу. Вместе с тем нужно более активно переходить к инвестиционному сотрудничеству, расширять промышленную кооперацию и, главное, создавать совместные белорусско-российские кластеры — в нефтехимии, фармацевтике, льняной отрасли и других отраслях, представляющих взаимный интерес. Таким образом мы не будем зависеть от политических настроений третьих стран и существенно укрепим экономическую безопасность Союзного государства. Инвестиционная деятельность — это формула прогресса.

Уважаемые руководители федеральных округов и регионов России!

Мы в Беларуси создаем комфортные условия для работы российских компаний. Но нас беспокоит то, что компании с российским капиталом, являющиеся резидентами Республики Беларусь, выводят из нашей страны заработанную у нас прибыль, вместо того чтобы ее в основном реинвестировать. В прошлом году изъято прямым инвестором 50 % прибыли, в I квартале 2019 года — 75 %. В принципе это не противоречит белорусскому законодательству и международному праву. Но хотим попросить российских партнеров не ставить главной целью изъятие средств из Беларуси, а реинвестировать прибыль.

Сформировалось устойчивое мнение о том, что Беларусь покупает в России только сырьевые ресурсы, а на российском рынке продает готовую продукцию. Неправильное мнение.

Российская Федерация стабильно занимает 1-е место в списке поставщиков высоколиквидной продукции — товаров инвестиционного назначения: машин, оборудования, транспортных средств в Республику Беларусь, заметно опережая все другие страны. В 2018 году объем закупок только инвестиционных товаров в России превысил 1,1 млрд долл. США, что на 15 % больше, чем годом ранее. Тенденция роста сохраняется и в 2019 году. Более 80 % радиоаппаратуры и холодильников, свыше 90 % импорта телевизоров и стиральных машин — это российские товары. Стоимостный объем импорта российских легковых автомобилей увеличился в прошлом году в 1,6 раза (превысив 1 млрд долл. США). Активно идет рост закупок в текущем году.

Никаких ограничений для продаж российских товаров в Беларуси нет, хотя у нас, хочу подчеркнуть, имеются собственные аналоги. Ограничения доступа на российский рынок белорусских товаров, думаю, тоже будут устранены.

Уважаемые участники форума!

Важное направление — взаимодействие Беларуси и России в рамках глобальной инициативы «Один пояс, один путь». Полагаю, нашим странам необходимо активизировать построение транспортной логистики Китай — Европа. Нам нельзя упустить время. Новый Шелковый путь — это глобальный проект, и мы видим, что многие иные государства уже предприняли реальные действия, чтобы привлечь ресурсы и товарные потоки. Данная тема обсуждалась у нас в Совете Республики, в том числе с госсекретарем Союзного государства Г. А. Рапотой, который согласен быть координирующей организацией этого проекта. Предлагаю от имени VI Форума регионов войти с соответствующим предложением в Высший государственный совет Союзного государства Беларуси и России.

Еще одна перспективная сфера сотрудничества — космические исследования. Наши президенты одобрили создание российско-белорусского космического аппарата дистанционного зондирования Земли нового поколения с высоким пространственным разрешением и космической системы на его основе. Уже разработан эскизный проект, определены технические характеристики и оптимизирована стоимость работ. Прошу правительство Российской Федерации дать соответствующие поручения о начале следующего этапа работ — рабочего проектирования и открытии финансирования по данному проекту.

Уважаемые участники форума!

Инвестиционная деятельность — это формула развития, прогресса. В 2020 году VII Форум регионов придет в Беларусь. Предлагаю очередной форум провести с этой повесткой. На пути формирования единого экономического пространства страны сделали немало серьезных шагов навстречу друг другу. Вместе с тем нужно более активно переходить к инвестиционному сотрудничеству, расширять промышленную кооперацию и, главное, создавать совместные белорусско-российские кластеры — в нефтехимии, фармацевтике, льняной отрасли и других областях, которые представляют взаимный интерес. Таким образом мы не будем зависеть от политических настроений третьих стран и существенно укрепим экономическую безопасность Союзного государства.

Наши страны имеют большой потенциал для расширения региональных связей. И региональное сотрудничество не ограничивается Форумами регионов. Особое внимание мы уделяем визитам в Беларусь руководителей российских регионов. Мы всегда тщательно к ним готовимся. Проходят встречи у Президента, в правительстве, парламенте, рассматриваются конкретные проработанные предложения. Просим федеральные власти России содействовать деловым визитам российских регионов в Республику Беларусь.

Желаю всем участникам VI Форума регионов Беларуси и России плодотворной работы.

Беларусь і Расія зблізілі пазіцыі па праграме рэалізацыі дагавора аб Саюзнай дзяржаве

што праблемы, якія ўзнікаюць, вырашаюцца ў рабочым парадку. Вялікую ролю ва ўмацаванні двухбаковага супрацоўніцтва адыгрываюць рэгіёны.

Кіраўнікі верхніх палат парламентаў абмеркавалі парадак дня Форуму рэгіёнаў, які сёлета ў значнай ступені прысвечаны маладзёжнай палітыцы. Беларускі спікер звярнуў увагу, што праект выніковага дакумента атрымліваецца вельмі канкрэтны. Ён назваў яго няпростым у рэалізацыі, які патрабуе дадатковых намаганняў.

Міхаіл Мясніковіч і Валянціна Мацвіенка сышліся ў меркаванні, што форумы рэгіёнаў набылі сістэмны характар і такі фармат работы дысцыплінуе, патрабуе пастаяннага пошуку новых падыходаў і ідэй. Па традыцыі ў мерапрыемстве бяруць удзел прэзідэнты Беларусі і Расіі, што вельмі ганарова і адказна.

Зараз кантакты з рэгіёнамі Беларусі наладзілі 80 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Расійскі спікер пазітыўна ацаніла вынікі супрацоўніцтва: з'яўляюцца новыя сумесныя праекты, пашыраецца вытворчая кааперацыя.

Паводле БелТА.

Транспартны патэнцыял

Урэгуляваць спрэчныя пытанні па аўтаперавозках і развіваць высакахуткасны чыгуначны транспарт

Такія планы былі агучаны на палях VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

«Мы ў вельмі цесным кантакце з расійскімі калегамі працуем у частцы ўніфікацыі заканадаўства ў розных сферах транспартнай дзейнасці, уключаючы аўтамабільныя перавозкі, — у цяперашні час працуем над адпаведным пагадненнем, — паведаміў журналістам **міністр транспарту і камунікацый Беларусі Аляксей АЎРАМЕНКА.** — Плануем да канца года выйсці на падпісанне».

Ён растлумачыў, што гэты дакумент будзе агаворваць, у прыватнасці, пытанні рэгулявання дазвольнай сістэмы, выкарыстання малатанажнага транспарту. «Пагадненне комплекснае і рэгулюе ўсё наша ўзаемадзеянне ў частцы аўтамабільнага транспарту, — адзначыў міністр. — Ёсць пэўныя болевыя моманты, над якімі мы працуем. Калі казаць пра двухбаковыя адносіны ці транзітныя на ЕС — у нас свабоднае перамяшчэнне. Але ёсць пэўныя пытанні, звязаныя з паездкамі ў трэція краіны і з іх, а таксама з кабатажнымі перавозкамі».

Між іншым, пытанне развіцця транспартнага патэнцыялу знайшло працяг на пасяджэнні міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. **Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА** заявіў падчас яго, што нельга адзіную транспартную прастору паміж Беларуссю і Расіяй засноўваць на тэхналогіях мінулага стагоддзя.

«Мы з міністэрствамі транспарту да гэтага часу так і не сфармулявалі паняцце таго, што з'яўляецца адзінай транспартнай прасторай. Мы вырашылі гэтае пытанне самі для сябе неяк сфармуляваць. У выніку прыйшлі да высновы, што адзіная транспартная прастора не можа быць заснавана на тэхналогіі XIX ці XX стагоддзя. На жаль, у нас транспарт адпавядае менавіта гэтым паказчыкам», — звярнуў увагу Рыгор Рапота.

Ён растлумачыў, што дарога з Мінска ў Санкт-Пецярбург (прыкладна 800 км) на цягніку сёння займае каля 14 гадзін, а яшчэ ў 1882 годзе адзін з расійскіх падарожнікаў успамінаў, што з Лондана ў Глазга (каля 600 км) ён дабраўся па чыгунцы за 9 гадзін. Рух з Масквы ў Мінск на цягніку таксама не самы хуткі і займае прыкладна 10 гадзін, заўважыў Рыгор Рапота.

Такім чынам, падкрэсліў дзяржсакратар, па развіцці транспартных тэхналогій краіны знаходзяцца на ўзроўні мінулых стагоддзяў. «З дарогамі прыкладна тая ж самая сітуацыя», — дадаў ён.

На думку Рыгора Рапоты, неабходна развіваць хуткасныя магістралі як для чыгуначнага, так і для аўтамабільнага транспарту. Гэтае пытанне, дадаў ён, абмяркоўваецца ўжо досыць доўга і ўключана ў прыярытэты развіцця Саюзнай дзяржавы.

Намеснік старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Юрый ВАРАБ'ЁЎ адзначыў, што сенатары не валодаюць паўнамоцтвамі ў гэтай сферы, аднак яны могуць паскорыць прыняцце палітычнага рашэння, неабходнага для ўрэгулявання гэтых пытанняў.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА, каментуючы журналістам вынікі пасяджэння міжпарламенцкай камісіі, агучыла планы па развіцці высакахуткаснага чыгуначнага транспарту.

«Маецца на ўвазе напрамак паміж Санкт-Пецярбургам, Масквой і Мінскам, для таго каб гэта быў транзітны калідор», — паведаміла віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента.

«Гэта вельмі цікавая прапанова, якая будзе прапрацоўвацца і прапаноўвацца для абмеркавання кіраўнікам дзяржаў», — адзначыла яна.

Дарэчы, міжпарламенцкая камісія падвяла вынікі выканання рашэнняў V Форуму рэгіёнаў, які летась прайшоў у Магілёве, а таксама разам з прадстаўнікамі профільных ведамстваў абмеркавала развіццё транспартнага патэнцыялу і мадэрнізацыю адпаведнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы. Акцэнт быў зроблены на праблемных пытаннях, над вырашэннем якіх міністэрствы транспарту дзвюх краін каля года працавалі разам з зацікаўленымі бакамі. Сфарміраваны план па вырашэнні ўсіх пытанняў. «Работа праведзена вялікая і пазітыўная», — праінфармавала Мар'яна Шчоткіна.

У сваю чаргу, Юрый Вараб'ёў падкрэсліў, што форумы рэгіёнаў даюць магчымасць прымаць важныя рашэнні для развіцця Саюзнай дзяржавы. За час іх правядзення падпісана больш за 218 пагадненняў. На шостым форуме па выніках пасяджэння міжпарламенцкай камісіі заключаны яшчэ чатыры паміж Саветамі дэпутатаў рэгіёнаў Беларусі і заканадаўчымі сходамі Расіі. Кантрактаў за гэтыя гады заключана больш чым на 1,5 мільярда рублёў.

Цяперашні форум прысвечаны фарміраванню адзінай гуманітарнай і культурнай прасторы. Міжпарламенцкая камісія таксама не пакінула без увагі гэтую тэму. Дасягнута дамоўленасць аб правядзенні сумесных мерапрыемстваў, прысвечаных 75-годдзю Вялікай Перамогі. Агульны план будзе звярстаны да 1 кастрычніка.

Паводле БелТА.

ЗДАВАЛАСЯ, ГУСТА, А ДЗЕСЬЦІ І ПУСТА

Паводле статыстычных звестак у цяперашні час у нашай краіне больш за 95 % дзяцей ва ўзросце 3—6 гадоў атрымліваюць дашкольную адукацыю — гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у Еўропе. Пры гэтым наведванне дзіцячага садка не з'яўляецца абавязковым на працягу ўсяго дашкольнага дзяцінства. Згодна з дзяржаўным стандартам, толькі ў пяцігадовым узросце ўсе дзеці павінны быць забяспечаны падрыхтоўкай да навучання ў школе.
Сістэма дашкольнай адукацыі ў нашай краіне працягвае развівацца, улічваючы запыты бацькоў і патрабаванні часу. Усё гэта так, але часам новыя раёны растуць занадта хутка...

Будуецца 15 дзіцячых садкоў, а не хапае 20

Што датычыцца Мінска, то сёлета спецыялісты-забудоўшчыкі плануюць раскрыць новыя пляцоўкі ў Чыжоўцы і Лошыцы. Працягнецца забудова ў межах вуліц Шаранговіча — Гарэцкага — Рафіева. Узводзяць жыллё і прыватныя інвестары. Па інвестыцыйнай праграме на будаўніцтва інжынерна-транспартнай інфраструктуры выдзяляецца каля 170 мільёнаў рублёў. Запланаваны фінансавыя сродкі і на будаўніцтва 15 дзіцячых садкоў. «Такога ніколі не было. Заўсёды ўзводзілася не больш за пяцьсем аб'ектаў для дзяцей, але мікрараёны будуюцца і маюць патрэбу ў сацыяльнай інфраструктуры», — расказала **намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Ірына ГОНТАРАВА.**

У сталіцы сёння не хапае 20 дзіцячых садкоў і сямі школ. Гарвыканкам дэталёва даследаваў гэтае пытанне. І высветлілася, што месцы мінчан у дзіцячых садках часта займаюць дзеці жыхароў Мінскай вобласці, якія працуюць у сталіцы. Часцей за ўсё гэтая праблема актуальная для садкоў каля МКАД.

Пабудавана 46,5 тысячы новых кватэр і... 17 дзіцячых садкоў

А колькі будуецца? Летась арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 46,5 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 3966,1 тысячы «квадратаў» жылля. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1498,1 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 37,8 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 999,3 тысячы «квадратаў», у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 943 тысячы квадратных метраў. Сёлета ўрадам даведзена заданне абласцям і Мінску пабудаваць 4 мільёны квадратных метраў жылля. За пяць месяцаў ужо пабудавана 1240,8 тысячы квадратных метраў жылля.

Згодна з тэхнічным кодэксам усталяванай практыкі існуюць нормы планіроўкі забудовы населеных пунктаў. Дык вось, паводле гэтага дакумента, установы выхавання і адукацыі павінны забяспечваць сацыяльна гарантаваную патрэбнасць насельніцтва ў атрыманні адукацыі, працоўнага, эстэтычнага і фізічнага выхавання, аздараўлення дзяцей, фарміраваць адзіную планіровачную сістэму і ўключаць: дзіцячыя яслі, сады, пачатковыя, базавыя школы, вучэбна-педагагічныя комплексы, а таксама школы, ліцэі, гімназіі і іншыя.

Умяшчальнасць дзіцячых дашкольных устаноў варта ўстанаўліваць у залежнасці ад дэмаграфічнай структуры насельніцтва, прымаючы разліковы ўзровень забяспечанасці дашкольнымі ўстановамі дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 50 %, звыш трох да шасці гадоў — 85 %. Ёмістасць пазашкольных устаноў варта прымаць не больш за 10 % ад агульнай колькасці школьнікаў. Не рэкамендуецца праектаваць школы ўмяшчальнасцю больш за 1500 месцаў.

У гарадскіх паселішчах радыус абслугоўвання дзіцячых дашкольных устаноў і пачатковых школ або класаў варта прымаць да 500 метраў, базавых школ — да 800 метраў пры ўмове падвозу вучняў у школу і пры адпаведных педагагічных і санітарна-гігіенічных абгрунтаваннях дапускаецца павелічэнне радыуса абслугоўвання пачатковых і базавых школ.

У сельскіх населеных пунктах размяшчэнне ўстаноў выхавання і адукацыі павінна забяспечваць 30-хвілінную транспартную даступнасць. Прасторавая даступнасць ліцэяў і гімназій, а таксама ліцэйскіх і гімназічных класаў не рэгламентуецца.

Спецыялізаваныя дашкольныя ўстановы, ліцэі і гімназіі, пазашкольныя ўстановы рэкамендуецца размяшчаць у цэнтральнай і сярэдняй зонах Мінска, буйных, вялікіх гарадоў, а таксама ў раёнах канцэнтрацыі жыллёвага фонду высокай шчыльнасці. І яшчэ, колькасць аптэк, аптэчных кіёскаў вызначаецца на аснове асаблівасцяў планіровачнай структуры гарадскіх паселішчаў. У кожным квартале, мікрараёне павінен быць не менш за адзін аб'ект.

У поўным аб'ёме і ва ўсіх раёнах

Якасныя паказчыкі развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі Гродзеншчыны — у ліку самых высокіх у краіне. На гэтай ніве ў вобласці працуюць 423 установы дашкольнай адукацыі, у тым ліку 34 дашкольныя цэнтры развіцця дзіцяці.

Нарматыў забяспечанасці дзяцей месцамі ва ўстановах дашкольнай адукацыі вобласці выконваецца ў поўным аб'ёме ва ўсіх раёнах рэгіёна. Летась уведзены ў эксплуатацыю чатыры дзіцячыя садкі на 780 месцаў: у мікрараёнах-новабудоўлях Гродна (230 месцаў), Астраўца (190 месцаў), Навагрудка (190 месцаў), і Шчучына (170 месцаў). Працягваецца будаўніцтва двух дзіцячых садкоў на 230 месцаў кожны ў Лідзе і Астраўцы. У мэтах вырашэння праблемы недахопу месцаў у дзіцячых садках мікрараёнаў-новабудоўляў і жылых раёнаў інтэнсіўнай забудовы ў Гродне працуюць аўтобусныя маршруты «Дашкалёнак» рэгулярных зносін для падвозу бацькоў з дзецьмі ў ранішні і вячэрні час да аддаленых дзіцячых садкоў. У Скідзелі дзяцей у дзіцячыя садкі падвозяць з навакольных вёсак. З сельскіх населеных пунктаў, якія не маюць устаноў дашкольнай адукацыі, падвозяць 1830 выхаванцаў.

Сяргей КУРКАЧ.

У тэму

Для выхавання дзятвы ў Беларусі функцыянуе больш за 3,8 тысячы ўстаноў дашкольнай адукацыі. Усяго летась было пабудавана 17 такіх устаноў. У сярэднім штогод будуецца 15 дзіцячых садкоў.

ЦІКАВЫ ВОПЫТ!

Новая канцэпцыя

Дзіцячы садок № 100 на вуліцы Мазурава ў Гомелі ад іншых адрознівае не толькі круглая лічба нумара. Ён знаходзіцца на першым паверсе нядаўна пабудаванага дома ў новым мікрараёне № 19.

Увесь першы паверх цалкам адведзены пад дашкольную ўстанову. Цяпер у ёй выхоўваюцца 72 дзіцяці ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў. У Савецкім Саюзе дзіцячыя ўстановы нярэдка размяшчалі на першых паверхах дамоў. Потым ад такой практыкі адмовіліся, а вось цяпер палічылі, што прыйшоў час аднавіць добры вопыт.

Эксперымент рэалізаваў Гомельскі домабудаўнічы камбінат, які за свае сродкі ўзвёў сацыяльны аб'ект. Мэта ініцыятывы гарадскіх улад — зняць напружанасць з месцамі ў мікрараёнах новабудоўляў. Дарэчы, гэта пілотны праект не толькі для Гомеля, але і для краіны.

На ўзроўні абмеркавання, а потым і ўвасаблення ідэі ў жыццё было шмат скептыкаў, якія агучвалі свае сумненні наконт такога рашэння гарадскіх улад. Некаторыя спачувалі жыхарам, якія будуць пастаянна чуць дзіцячы гоман. Былі пытанні наконт вентыляцыі і распаўсюджвання пахаў з кухні садка па ўсім доме. Сумняваліся наконт бяспекі дзяцей. Маўляў, у дварах жа аўтамабілі ездзяць, і дзеці будуць пастаянна падвяргацца небяспецы. Чуліся меркаванні і наконт таго, што малыя не змогуць адпачываць, калі суседзі зверху будуць працаваць перфаратарам.

Праектанты і будаўнікі адказалі справай на кожнае з пытанняў.

Кошт будаўніцтва тыпавога садка — каля 8 мільёнаў рублёў. Убудаваны ў дом абышоўся ў 1,8 мільёна рублёў. Выдаткі на ўбудаваны дзіцячы садок утрая меншыя, чым сродкі для ўзвядзення асобнага будынка.

Побач абгароджаная пляцоўка з верандамі, пясочніцамі і ўсімі неабходнымі для гульні прыстасаваннямі. Уваходы ў дзіцячы садок і жылую частку знаходзяцца з розных бакоў. Ніхто нікому не перашкаджае: паміж садком і будынкам транспарт не рухаецца. Для машын прадугледжаны месцы і праезды са зваротнага боку дома.

Унутры ёсць усё неабходнае для развіцця дзяцей: групавыя памяшканні, музычна-спартыўная зала, санкавая (там зімой пакідаюць санкі, а ўлетку — самакаты і веласіпеды), рэсурсныя цэнтры для кожнай групы і гэтак далей. Усё разлічана для трох груп па 20 дзяцей. Па факце іх цяпер больш. Дарэчы, зараз ідзе прыём дзетак на навучальны вучэбны год, гаворыць **загадчык дзіцячага садка № 100 Гомеля Вольга КАЛЕСНІКАВА:**

— Першыя выхаванцы прыйшлі да нас у садок 3 студзеня 2018 года. За паўтара года мы і адчулі і зразумелі, што ўмовы для нас зроблены вельмі зручныя. Ніякіх глабальных пытанняў па змяненні ці рамонце

НЕ ЎСЁ АДРАЗУ

Раён новабудоўлі «Лагуна» абрастае інфраструктурай паступова

Нядаўна Ірына Нікановіч з сям'ёй пераехала ў новую кватэру і стала адной са шматлікіх навасёлаў брэсцкага раёна з рамантычнай назвай «Лагуна». Гэта неафіцыйнае найменне, але яно адразу замацавалася за новымі кварталамі, якія літаральна на вачах выраслі за папулярным у брастаўчан рынкам з такой назвай. Ну што зробіш, нераўнадушная гаспадыня рынку да марской тэматыкі. З яе лёгкай рукі і нараджаюцца назвы. Магчыма, падобным чынам з'яўляюцца назвы наогул...

Дык вось гэты самы раён забудоўваецца паміж раёнамі горада Усход і Кавалёва. Тут яшчэ зусім нядаўна была пустая, крыху забалочаная зямля з аграмаднымі калоніямі чаек. Птушкі паляцелі на іншыя месцы, а ў «Лагуне» выраслі новыя дамы, тэрыторыю асвойваюць людзі. Дамы паўставалі літаральна на вачах, у будоўлі прымаў удзел кітайскі інвестар. Панэльныя шматпавярховікі выглядаюць не аднолькава шэрымі, як у старэйшых раёнах горада, яны размаляваныя рознымі пейзажамі і арнаментамі. Напрыклад, фасад аднаго ўпрыгожвае слова «зіма», іншага — «вясна», далей — «восень», «лета» з адпаведнай расфарбоўкай. Адным словам, краявіды не сумныя, сюжэт «Іроніі лёсу» тут не падыходзіць. Але Ірына, мама ў дэкрэтным, занепакоеная тым, што месца ў новым садку яе дачушцы, якая пакуль што аглядае мясцовасць з каляскі, можа не хапіць. Крамы паблізу няма, пошта і банк у суседнім (цераз дарогу. — **Аўт.**) раёне. Кватэру Нікановічы пабудавалі

Тэлесеткі

З ЛЫЖКАЙ НАПЕРАВЕС

20 ліпеня ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» смачная прэм'ера — забаўляльна-пазнавальнае шоу «Тваё месца на кухні». І хоць назва гучыць правакацыйна, але гендарных спрэчак у праграме няма.



Затое ёсць кулінарыя: 14 навічкоў і прафесійных кухараў, сярод якіх і мужчыны, і жанчыны, перамяшаныя і ў прыблізна роўных прапорцыях падзеленыя на дзве каманды, спаборнічаюць у хуткасці ды якасці прыгатавання страў высокай кухні.

Заданне — «страву дня» — у кожным выпуску дае шэф-повар аднаго з мінскіх рэстаранаў, Тамаза д'Амата на пару з вядучым, шоўменам Арцёмам Рыбакіным. Напрыканцы ён жа выносіць вердыкт, чыя страва лепшая і правільна прыгатаваная. Тая з камандаў, якая не ўклалася ў час альбо парушыла тэхналогію, лічыцца прайграўшай і будзе вымушаная пазбавіцца аднаго са сваіх удзельнікаў. «Пакінуць праект можа і не адзін удзельнік, — інтрыгуе прадзюсар шоу, — канчатковае слова за нашым шэф-поварам. А ён карэнны італьянец, вельмі імпульсіўны, і калі, палічыць, што нехта сапсаваў страву, — развітаецца без літасці!»

А вось кухара-пераможцу ў фінале арганізатары абяцаюць адзначыць спецыяльным прызам — сертыфікатам на навучанне ў маскоўскай кулінарнай школе. Гледачы ж змогуць занатаваць цікавыя рэцэпты і запомніць дзякуючы фота паслядоўнасць усіх этапаў гатавання, а потым паспрабаваць паўтарыць стварэнне рэстараннай стравы ў сябе на кухні.

Выходзіць шоу «Тваё месца на кухні» будзе па суботах і нядзелях у дзённым эфіры — усяго запланавана 12 выпускаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота дадзена студыяй Rybaking Produktion.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 73

Аўтар сённяшняй задачы — беларускі складальнік Уладзімір Іваноў ***(гл. дыяграму)***.

Белыя: Крe7, Фа4, Лd1, Лe4, Ch1, Kb5, Kd4 (7).

Чорныя: Крd5, Лd2, Лd3, Сe1, Ch7, Ke8, пп. c5, h4 (8).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Працягнем расповед пра сёлетнія чэмпіянаты Беларусі. У наступнай партыі гросмайстар, будучы другі прызёр, перайграў 12-гадовага майстра.

Арцём Стрыбук — Кірыл Ступак. 1. d4 d6 2. g3 g6 3. Cg2 Cg7 4. Kf3 c5 5. dc Фa5+ 6. c3 Ф:c5 7. Ce3 Фc7 8. 0-0 Kf6 9. Ka3 0-0 10. Kb5 Фa5 11. a4 a6 12. Ka3 Фc7 13. Фb3 Ce6 14. Фb6 Фc8 15. c4 Kc6 16. Фb3 Kd7 17. Kg5 Cf5 18. Ke4 b6 19. Лac1 Kc5 20. K:c5 bc 21. Фa2 Лb8 22. b3 Ka5 23. Cg5 K:b3 24. Лcd1 Лe8, 0:1.

А тут, наадварот, 13-гадовы майстар узяў верх над вопытным гросмайстрам.

Дзяніс Лазавік — Віталь Цецераў. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. g3 Cg7 4. Cg2 0-0 5. Kc3 d6 6. Kf3 Kbd7 7. 0-0 e5 8. e4 Лe8 9. h3 a6 10. Ce3 ed 11. K:d4 Лb8 12. b3 Ke5 13. a4 Kfd7 14. Фd2 Kc5 15. Лad1 a5 16. Фc2 Ka6 17. Kdb5 b6 18. f4 Kd7 19. e5 de 20. f5 e4 21. Фd2 Kac5 22. C:c5 bc 23. K:e4 Фe7 24. K:c7 Cd4+ 25. Kph2 Лd8 26. Kd5 Фf8 27. fg hg 28. Фg5 Лe8 29. Л:d4 cd 30. Kdf6+ K:f6 31. K:f6+ Крg7 32. Фh4 Фh8 33. Ф:d4 Лd8 34. Kd7+, 1:0.

Дзве наступныя перамогі атрымалі адпаведна «сярэбраны» і «бронзавы» прызёры жаночага чэмпіянату.

Рахіль Эйдэльсон — Наталля Кусянкова. 1. Kf3 d5 2. e3 Kf6 3. c4 e6 4. b3 c5 5. Cb2 Kc6 6. cd ed 7. Cb5 Cd7 8. 0-0 Cd6 9. C:c6 C:c6 10. d4 b6 11. Ke5 Cb7 12. Kc3 0-0 13. Ke2 Фe7 14. Kg3 g6 15. Лe1 Лad8 16. a3 Kd7 17. Kg4 f6 18. h4 Фg7 19. Фd2 h5 20. Kh2 Лfe8 21. Kf3 C:g3 22. fg c4 23. bc dc 24. d5 Kc5 25. e4 K:e4 26. Л:e4 Л:e4 27. Kg5 Л:d5 28. Фc2 Лe3 29. Фf2 Лde5 30. C:e5 Л:e5 31. Kf3 C:f3 32. Ф:f3 Фe7 33. Kph2 Крg7 34. Лd1 Лe3 35. Фf4 Лd3 36. Лf1 b5 37. a4 a6 38. ab ab 39. Лf2 Фe5, 0:1.

Генрыета Лагвілава — Ланіта Сцяцко. 1. f4 d5 2. Kf3 Cg4 3. Ke5 Cf5 4. d4 f6 5. Kf3 Kc6 6. e3 a6 7. Cd3 Фd7 8. C:f5 Ф:f5 9. 0-0 Фd7 10. b3 Kh6 11. c4 e6 12. Kc3 Ce7 13. Фe2 Kf5 14. Cb2 Cb4 15. Kd1 dc 16. bc 0-0 17. Kf2 b6 18. Лfd1 Фf7 19. Лac1 Лfd8 20. g4 Kfe7 21. a3 Ca5 22. g5 fg 23. K:g5 Фg6 24. Kph1 Kf5 25. d5 ed 26. cd Kce7 27. e4 Kd6 28. Ke6 Лe8 29. Лg1, 1:0.

* * *

На Мемарыяле Р. Нежметдзінава ў Казані Валерый Казакоўскі заняў 17-е месца са 179 удзельнікаў, а ў хуткіх шахматах Мікіта Маёраў быў дзявяты з 220. На турніры ў Каралёве (Расія) Раман Лаўрэцкі і Станіслаў Цыганчук падзялілі 7-8 месцы. Уладзіслаў Кавалёў выступіў на прэстыжным турніры імя А. Карпава ў расійскім горадзе Пайкоўскі, але, на жаль, заняў апошняе, дзясятае, месца. Андрэй Гаравец падзяліў 2—9 месцы ў ЗША (108 гульцоў). У індыйскім Мумбаі (150 удзельнікаў) Аляксей Аляксандраў заняў 24-е месца, Кірыл Ступак — 25-е. У Стакгольме Станіслаў Цыганчук падзяліў 1-2 месцы. У Варонежы (115 удзельнікаў) Мікіта Маёраў быў трэці, а Аляксей Фёдараў — пятнаццаты. У літоўскім Паневяжысе (26 гульцоў) Вольга Бадэлька фінішавала трэцяя, а Валерый Казакоўскі быў тут першы ў бліцтурніры сярод 50 удзельнікаў. Тры прызавыя месцы на Мемарыяле Г. Верасава ў Мінску (57 удзельнікаў) занялі Андрэй Савіцкі, Антон Шарамет і Генрыета Лагвілава. На рэспубліканскай спартакіядзе школьнікаў прызавую тройку склалі зборныя Мінска, Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фg5! Першымі правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Васіль Жуковіч.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

ТРЫ НАГОДЫ ЎКЛЮЧЫЦЬ ТЭЛЕВІЗАР

ЗАМАЛЁЎКІ З НАТУРЫ

«Як уладкаваны свет» — навукова-папулярная праграма пра тое, што чалавек насамрэч ніякі не цар прыроды, як лічаць многія, седзячы на ўтульнай канапе, а толькі дробная яе частка. Журналіст і папулярызатар навукі Цімафей Бажэнаў на працягу двух сезонаў выпрабоўвае на сабе навуковыя факты пра самыя розныя прыродныя з'явы і робіць з гэтага не сухі аповед, а экстрэмальныя прыгоды.

Якія ўласцівасці холаду карысныя, а якія небяспечныя для чалавека? Ці можна прайсціся па лаве і падпаліць ваду? Якія сакрэты захоўвае звычайная соль? Ці здольны чалавек паляцець на крылах альбо звычайных паветраных шарыках? Як пачысціць зубы, калі ёсць толькі пясок і гліна? Усе гэтыя і многія іншыя рэчы здымачная група праграмы праверыла, што называецца, у палявых умовах, расказваючы і паказваючы, як можна выжыць гома сапіенсу ў дзікай прыродзе. Вынік — у кожным выпуску праекта «Як уладкаваны свет» на СТБ з панядзелка да пятніцы.

УЛАДЗІМІР ВЫСОЦКІ

25 ліпеня, у дзень памяці вялікага акцёра, паэта і барда, многія тэлеканалы традыцыйна паказваюць кінафільмы з яго ўдзелам. Напрыклад, на канале МІР гэта будзе «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў» (1976), таксама гэту стужку пакажа канал «Культура» 28 ліпеня.

У фільме Аляксандра Міты Высоцкі сыграў «сына цемнаскурага цара» Ібрагіма Ганібала — выхаванца Пятра I, маладога навукоўца, гераічнага воіна, але разам з тым дуэлянта і донжуана, чые амурныя прыгоды ў замежжы скончыліся скандалам і высылкай назад у Расію. Тут ён закахаўся ў дачку аднаго з прыдворных, і цар не супраць ажаніць хрэсніка, аднак на руку дзяўчыны прэтэндуе іншы кавалер, а сама яна баіцца «чорнага чалавека»...

Як згадваюць удзельнікі здымачнага працэсу, рэжысёр адразу вырашыў рабіць гэту экранізацыю Пушкіна «пад Высоцкага». Акцёр жа бачыў свайго героя як «інтэлігентнага чалавека ў неінтэлігентным свеце» і так натхніўся вобразам Ібрагіма, што сам зацвердзіў на ролю яго каханай партнёрку — Ірыну Мазуркевіч, а таксама напісаў для карціны дзве песні — «Разбойніцкую» і «Купалы». Аднак яны аказаліся настолькі пранізлівымі, што маглі ўскладніць пракатны лёс карціны, і рэжысёр са шкадаваннем ад іх адмовіўся. Цэнзары прымусілі скараціць і хронаметраж — з дзвюх запланаваных серый трагікамедыі засталася толькі адна, камедыйная, дый тую перайменавалі. І ўсё ж, нягледзячы нават на разгромную крытыку ад некаторых вядомых культурных дзеячаў, фільм за год убачылі звыш 36 мільёнаў савецкіх гледачоў, і дзясяткі краін закупілі яго для пракату.

ВОДПУСК

Калі адпачыць гэтым летам вам яшчэ не выпала, праграма «Вакол свету падчас дэкрэту» выдатна матывуе паскорыць гэту радасную падзею. У праекце спявачка і тэлевядучая Ганна Седакова разам з трыма дзецьмі — дачкой-падлеткам, немаўлём-сынам і дашкольніцай-хрэсніцай — спрабуе вытрымаць звыклы рытм жыцця, актыўна падарожнічаць і спасцігаць новае.

Дапамагаюць зладзіць гэтыя вандроўкі такім чынам, каб і дзеці, і мама засталіся задаволеныя, маладыя матулі з розных краін: яны падказваюць, дзе лепш пакаштаваць традыцыйную кухню, якія выбраць забавы і да каго зазірнуць у госці. А старэйшая дачка тым часам здымае відэаблогі для аднагодкаў, даючы ім турыстычныя парады, дзе пагуляць і што пабачыць. Грузія, Іспанія, Італія... З гэтых паездак атрымаўся забаўляльны трэвел-дапаможнік для сямейнага адпачынку. Наколькі ён карысны? Паглядзіце праграму на канале ВТБ з аўторка да пятніцы і складзіце ўласнае меркаванне!

панядзелак, 22 ліпеня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.40 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
Дарэчы, мікрараёнам пад агульнай назвай Білева ўжо больш за дваццаць гадоў. Там жыве каля 40 тысяч чалавек — больш чым у адразу некалькіх раёнах Віцебшчыны. Сёння там тры садкі. Ёсць школа. Плануюць пабудаваць самы вялікі ў краіне вучэбна-педагагічны комплекс прыкладна на 960 дзяцей. У тым ліку для каля 560 дашкольнікаў. Фактычна гэта адпавядае напаўняльнасці адразу трох садкоў. Астатнія месцы — для вучняў пачатковай школы.

Як растлумачыў **старшыня Віцебскага гарвыканкама Віктар НІКАЛАЙКІН,** гэты аб'ект дазволіць закрыць праблему недахопу месцаў у садках. Ды яшчэ маштабнасць аб'екта грамадскага прызначэння, між іншым, дазволіць і сэканоміць. Па прыблізных падліках — мінімум 20 % фінансавых выдаткаў. Канкрэтныя сумы пакуль што дакладна падлічыць цяжка, але вопытны мэр мяркуе, што цана пытання — каля 20 мільёнаў рублёў. Будаўніцтва плануецца распачаць ужо сёлета. Агучана, што фінансаванне магчыма весці за кошт крэдыту Банка развіцця.

Для параўнання апошні садок, які адкрылі ў Білева ў лістападзе летась, абышоўся прыблізна ў дзевяць мільёнаў рублёў. Трэці па ліку білеўскі дзіцячы садок № 113 «Васілёк» наведвае каля 230 юных гараджан. Ва ўстанове ёсць трэнажорная, спартыўная залы, басейн, сэнсарны пакой і іншае.

Яшчэ ў Білеве будуецца новая школа. Увод яе ў эксплуатацыю — 2020 год.

На слыху яшчэ адзін віцебскі спальны мікрараён — Медцэнтр. Там усяго адзін садок. Як удакладнілі ў аддзеле адукацыі Віцебскага гарвыканкама, сёлета плануецца набор 32 дзяцей ва ўзросце ад 1,5 да 3 гадоў. А маюць патрэбу 132. Для хлопчыкаў і дзяўчынак старэйшага ўзросту ў садку паблізу іх дамоў месцаў няма.

Наконт школы ў Медцэнтры: свая адсутнічае, але недалёка — у іншых мікрараёнах, напрыклад, Поўдзень — ёсць установы адукацыі. Нядаўна, дарэчы, недалёка ад Медцэнтра адкрылі новы паліклінічны комплекс, у тым ліку з педыятрычным аддзяленнем.

Дарэчы, у згаданых вышэй мікрараёнах параўнальна добрае транспартнае забеспячэнне. Недалёка ад Медцэнтра трамвайнае кальцо. І туды ж ходзяць тралейбусы, аўтобусы, маршрутныя таксі. Ёсць і прыпынак для дызеля, на якім вельмі зручна дабірацца да вакзала, а значыць, амаль у цэнтр горада.

Праблема недахопу ўстаноў адукацыі і аховы здароўя ў новых мікрараёнах, як той казаў, «з барадой». Яна, дарэчы, была актуальная яшчэ ў савецкі час. Бадай, ужо трэба было даўно забудоўвацца так, каб радасць навасельля не была азмрочана перажываннямі. Але ўсё адносна. Калі ёсць аўто, або зручна даехаць на грамадскім транспарце, дык, напэўна, праблема і зусім такой не з'яўляецца? Але ж, як вядома, чалавек заўсёды хоча як лепей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У ЗОНЕ ДАСЯГАЛЬНАСЦІ

Карэспандэнт «МС» высвятляла, наколькі падрыхтаваныя для навасёлаў новыя мікрараёны Магілёва

Казіміраўка ў Магілёве — адзін з тых мікрараёнаў, дзе зараз ідзе актыўнае будаўніцтва жылля. Вядомая справа, той інфраструктуры, якая тут існавала раней, ужо не хапае. Летась у мікрараёне быў здадзены дзіцячы садок на 240 месцаў з плавальным басейнам, а сёлета плануецца адкрыццё новай школы — № 46. Адзіная тутэйшая школа № 19 ужо не вытрымлівала тых нагрузак, якія на яе ўскладаліся.

Патрэбны аб'ект

— Мы спадзяёмся, што ўсе неабходныя работы будуць выкананыя да пачатку навучальнага сезона, — кажа **начальнік упраўлення адукацыі Магілёўскага гарвыканкама Ірына НОВІКАВА.** — Цяпер яны вядуцца ў паскораным рытме, на аб'екце кожны тыдзень праводзяцца планёркі з удзелам мэра горада Уладзіміра Цумарава. Школа разлічана на 1020 вучняў, і на 1 ліпеня да нас паступіла ўжо 500 заяў ад бацькоў будучых школьнікаў. Тут будзе створана безбар'ернае асяроддзе, устаноўлены сучасныя сродкі інфарматызацыі і сістэмы бяспекі з камерамі відэаназірання і электронным прапускным рэжымам. Другім этапам будаўніцтва стане стварэнне басейна.

Усяго ў горадзе функцыянуе 42 школы, дзе вучацца 37 600 дзяцей. Па словах суразмоўніцы, гэтага дастаткова, каб забяспечыць якасны адукацыйны працэс. А калі ў каго і ўзнікае жаданне накіраваць дзіця ў якую-небудзь канкрэтную школу, то пытанне вырашаецца на ўзроўні школы або аддзелаў па адукацыі адміністрацый раёнаў.

Галіна БЯЛЯЕВА, дэпутат Магілёўскага гарсавета і завуч 34-й сярэдняй школы Магілёва, ведае праблему знутры. Яна сама пяць гадоў таму пабудавала жыллё ў новым маладзёжным мікрараёне Спадарожнік — да Казіміраўкі ад яго рукой падаць. Школа і дзіцячы садок у Спадарожніку будаваліся адначасова з жылымі дамамі, а вось крамаў, прызнаецца суразмоўніца, не хапала. Затое цяпер ёсць на любы густ — і «Рублёўскі», і «Еўраопт», і «Парк Авеню».

— Адзінае, чаго тут няма, паліклінікі — і дзіцячая, і дарослая на адлегласці прыкладна пяці прыпынкаў, але побач знаходзіцца абласная бальніца з кансультацыйнай паліклінікай. Калі трэба нешта аператыўна вырашыць, ніякіх праблем, — кажа жанчына. — Наогул, інфраструктура нашага раёна развіваецца вельмі хутка. Адкрываюцца новыя крамы, ёсць цырульня. У школе функцыянуе басейн, у дварэ — трэнажорная зала, валейбольнае поле, баскетбольная пляцоўка, стол для настольнага тэніса. А навокал прырода — Пячэрскі лесапарк, возера. І паветра больш чыстае, чым у цэнтры горада. Наогул, я тут упершыню пачула, як спяваюць птушкі.

Дэпутаты прагаласавалі за паліклініку

Цяпер актыўнае будаўніцтва вядзецца не толькі ў мікрараёне Казіміраўка, але і на вуліцах Стасава і Грышына.

— Пры наяўнасці фінансавання тут таксама будзе распачата будаўніцтва школы і дзіцячага садка, — кажа **галоўны архітэктар Магілёва Уладзімір СКАЧАК.** — Наогул, пры распрацоўцы новых мікрараёнаў жылой забудовы заўсёды разлічваецца патрэба ў дзіцячых дашкольных і школьных вучэбных установах.

Стварэнне камфортных умоў для пражывання гараджан — клопат у тым ліку і дэпутатаў.

— Такога, каб да нас паступалі пісьмовыя запыты аб садзейнічанні з уладкаваннем у дзіцячы садок або школу, не было, — кажа **старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Максім ГУРЫН.** — Такія пытанні ў Магілёве здымаюцца ў рабочым парадку. Гэтым ушчыльную займаюцца аддзелы адукацыі раённых адміністрацый. Мы ж, са свайго боку, заўсёды гатовы дапамагчы разабрацца.

Фота Рамана РУЦКАГА.

А нядаўна дэпутаты падтрымалі рашэнне распачаць сёлета, у адпаведнасці з інвестыцыйнай праграмай, будаўніцтва новай паліклінікі ў мікрараёне Казіміраўка. Праект ужо ёсць, крыніцы фінансавання вызначаны.

Кітайскія дамы пад беларускія стандарты

Удзел у будаўніцтве жылля ў Магілёве прымаюць і кітайскія партнёры. Першы дом з дапамогай кітайскага капіталу быў здадзены пазалетась у тым жа раёне Казіміраўка. Двухпад'езны шматпавярховік на 120 кватэр пабудаваны ў рамках аказання тэхніка-эканамічнай дапамогі КНР малазабяспечаным сем'ям. Аналагічныя дамы ўзведзены ў Бабруйску і Асіповічах.

Яшчэ восем прыватных кітайскіх домікаў сядзібнага тыпу хутка з'явяцца на ўскрайку горада ў раёне былой вёскі Гарадшчына.

— Гэтыя канструкцыі былі для нас новыя. Давялося адаптаваць кітайскія эскізныя праекты пад нашы беларускія параметры і тэхнічныя ўмовы, — кажа **Андрэй МАСКАЛЁЎ, дырэктар прадпрыемства «Упраўленне капітальным будаўніцтвам горада Магілёва».** — Інжынерныя сеткі і добраўпарадкаванне робяцца за наш кошт, а вось мантаж і ўнутранае ўстройванне фінансуе кітайскі бок.

Сёлета гарадскі УКБ плануе пабудаваць у Магілёве 100 тысяч квадратных метраў жылля са 170 тысяч запланаваных. Забудова будзе весціся ва ўжо існуючых жылых мікрараёнах. Таму ў планах сацыяльных аб'ектаў няма. Што датычыцца дамоў, то яны будуць здавацца як і трэба — з дзіцячымі пляцоўкамі і малымі архітэктурнымі формамі.

Вясковая школа са STEM-ухілам

У першую чаргу новыя дзіцячыя садкі і школы будуюцца там, дзе жыццё віруе і ўзводзяцца жылыя дамы. Сёлета, напрыклад, распачалі будаўніцтва дзіцячага садка на 40 месцаў у аграгарадку Дабрэйка Шклоўскага раёна і рэканструкцыю з мадэрнізацыяй, якая прадугледжвае прыбудову на 50 месцаў, ясляў-сада ў аграгарадку Васход Магілёўскага раёна. Акрамя гэтага распрацавана і зацверджана праектна-каштарысная дакументацыя на будаўніцтва дзіцячага садка на 240 месцаў з басейнам у мікрараёне № 7 Бабруйска.

— У вобласці сёння функцыянуе 345 устаноў адукацыі, дзе вучацца 109 867 чалавек, — кажа **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Сяргей СЫРАНКОЎ.** — Для захавання школ у сельскай мясцовасці мы праводзім іх рэарганізацыю і ствараем вучэбна-педагагічныя комплексы «дзіцячы сад — сярэдняя школа». Але колькасць сельскага насельніцтва, на жаль, не павялічваецца, таму ў некаторых выпадках даводзіцца і закрываць школы. Дзеці з тых вёсак, дзе ўтрымліваць школу немэтазгодна, пераводзяцца ў навучальныя ўстановы з сучаснымі ўмовамі адукацыі. Для арганізацыі падвозу больш чым 8 тысяч дзяцей да месца вучобы і назад у вобласці выкарыстоўваецца 225 школьных аўтобусаў. І сёлета плануецца набыць яшчэ 32 аўтобусы, восем з якіх — для перавозкі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Сёння стаўка робіцца на школы будучага, дзе і напаўненне, і адукацыя вядуцца па сусветных стандартах. У аграгарадку Вяззе Асіповіцкага раёна, напрыклад, за кошт сродкаў Сусветнага банка школа мадэрнізуецца пад STEM-фармат. Гэта так званая інавацыйная пляцоўка, дзе будуць выхоўвацца грамадзяне новага пакалення, з перадавымі поглядамі і мысленнем. Наогул па праекце «Мадэрнізацыя сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь» у вобласці плануецца абнавіць 33 школы. Гэтым праектам прадугледжаны не толькі капітальны рамонт навучальных устаноў, але і стварэнне ўмоў для высокатэхналагічнага адукацыйнага працэсу. І гэта ў першую чаргу датычыцца тых школ, куды ажыццяўляецца падвоз дзяцей з неперспектыўных вёсачак.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПОПЫТ НА НАВУЧАННЕ

— Па што стаім? — пыталіся цікаўныя ў татаў і мам, што ў сярэдзіне чэрвеня выстройваліся ў чаргу каля сцен 4-й гімназіі. А тыя адказвалі, што па родную мову, па добрае навучанне, ім падабаецца, што школа дае магчымасць вывучаць некалькі замежных моў, што ў ёй працуе вялікая колькасць разнастайных гурткоў. За чацвертай гімназіяй замацаванага мікрараёна няма, яна абавязана прымаць усіх дзяцей, чые бацькі выбіраюць беларускамоўнае навучанне. І з кожным годам у раёне такі попыт павялічваецца.

У першы ж дзень прыёму дакументаў пад дзвярыма школы сабралася больш за сотню чалавек. Некаторыя тут аддзяжурылі цэлыя суткі — спачатку адседзелі ў спякотны дзень, а пасля яшчэ засталіся і на ноч. Самыя прадбачлівыя нават свае крэслы прынеслі... Такія ўжо бацькі ў Каменнай Горцы — ці не самага багатага на дзяцей мікрараёна Мінска. Натуральна, дарослыя хвалююцца — страхуюцца, каб малым хапіла месцаў у першых класах загадзя аблюбаваных школ. Кіраўніцтва «асаджаемай» гімназіі выдатна справілася са складанай задачкай. За тры гадзіны ў першы ж дзень падачы дакументаў у «чацвёрцы» змаглі прыняць ажно каля сотні чалавек!

Пра чэргі пры наборы першакласнікаў пад дзвярыма розных школ мы чуем ужо не першы год. Хоць такі нязручны для бацькоў і ўстаноў адукацыі сцэнарый пры падачы дакументаў можна лёгка папярэдзіць.

— Я здзіўлена вопытам бацькоў, якія вымушаны былі стаяць у чэргах, — прызнаецца **намеснік старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, дырэктар сталічнай гімназіі № 6 Вольга СМІРНОВА.** — У большасці ўстаноў адукацыі сістэма прыёму ў першыя класы прадумана такім чынам, каб гэта было камфортна для бацькоў, каб здымалася сацыяльнае напружанне. Напрыклад, у нашай навучальнай установе пачынаючы з 12 чэрвеня адбываецца прыём дакументаў у першыя класы тых дзяцей, якія пражываюць па мікрараёне. Законныя прадстаўнікі дзяцей, якія пражываюць па-за межамі раёна, маюць магчымасць падаць заяву на свабоднае месца, але яна будзе разгледжана толькі 28 жніўня, калі будзе скончаны прыём дзяцей па мікрараёне. Спецыяльна створаная камісія праводзіць пасяджэнне, падлічвае колькасць вольных месцаў і вырашае, колькі дзяцей з тых ахвотных, якія не адносяцца да мікрараёна пражывання, можна залічыць і якія гэта будуць дзеці. Прынцып выбару вельмі просты: у першую чаргу разглядаюцца заявы тых бацькоў, у якіх тут ужо навучаюцца старэйшыя сыны ці дочкі. Гэта вельмі правільнае, лагічнае рашэнне, яго прытрымліваюцца ўсе ўстановы адукацыі. Для таго каб не было чэргаў, устаноўлены парадак, з якім установы адукацыі знаёмяць праз свае сайты. Існуе папярэдні запіс на падачу заяў на свабоднае месца і на падачу дакументаў. Людзі прыходзяць на запісаны час, ніхто не займае чаргу з 5—6 гадзін раніцы.

— 28 жніўня — крайні тэрмін. І для бацькоў гэта выпрабаванне — да апошніх дзён жніўня не ведаць, ці патрапіць дзіця ў абраную школу. Можа, трэба на сайтах школ вывешваць спісы, з якіх будзе бачна, колькі ёсць вольных месцаў і прэтэндэнтаў на іх?

— Я лічу, што такая інфармацыя не будзе заспакойваць бацькоў. Дырэктары прымаюць грамадзян з заявамі на вольнае месца, падчас якіх абавязкова папярэджваюць, што можа скласціся такая сітуацыя, што вольных месцаў не будзе, каб яны маглі падстрахавацца. Бацькі маюць права падаць заявы ў любую колькасць устаноў адукацыі.

— А ці задаволены сёння попыт на беларускамоўныя школы?

— У кожным раёне ёсць установа адукацыі, якая ажыццяўляе навучальны працэс на беларускай мове. Акрамя таго, калі бацькі падаюць заявы і дакументы ў рускамоўныя школы, могуць указваць, на якой мове жадаюць, каб вучылася іх дзіця. Як правіла, бацькі загадзя вызначаюцца, куды падаваць дакументы. І недахопу па горадзе ў арганізацыі адукацыйнага працэсу на беларускай мове няма. Да таго ж у нас дастаткова кваліфікаваных кадраў, каб адкрываць пры наяўнасці неабходнай колькасці ахвотных беларускамоўныя класы. Іншая справа, што такіх запытаў няшмат, напрыклад, у нашу гімназію паступалі толькі адзінкавыя — як правіла, ад бацькоў, якія згодны на навучанне і на рускай, і на беларускай мове.

— З якімі пытаннямі бацькі звяртаюцца ў камісію па адукацыі, навуцы і спорце?

— Верыце ці не, але падчас маёй дэпутацкай дзейнасці не было ніводнага пытання, звязанага з адукацыйным працэсам. Гэта сведчыць, што праблемы, якія ўзнікаюць, добра вырашаюцца на месцах, над імі працуюць спецыялісты і кіраўнікі ўсёй сістэмы адукацыі.

— І ўсё ж, чаму бацькі так хочуць аддаваць дзяцей менавіта ў гімназіі? Можа, прасцей было б змяніць шыльды, напрыклад, каб усе ўстановы сталі гімназіямі?

— Нават калі назваць аднолькава, установы адукацыі ўсё роўна будуць адрознівацца. Тая ці іншая ўстанова адукацыі можа ісці наперад у нейкім кірунку, які цікавы бацькам, другая ўстанова будзе развіваць іншы запатрабаваны кірунак. Сёння кожная ўстанова адукацыі, і я ў гэтым не сумняваюся, мае свае адметнасці, свае станоўчыя бакі і дасягненні. Звяртаючыся да бацькоў, я хацела б сказаць: «Не бойцеся аддаваць дзіця ў тую ўстанову, у якую дзіцяці будзе бліжэй дабірацца, камфортна з яе вяртацца дадому. Праз некалькі гадоў яно гэта будзе рабіць самастойна. Не бойцеся пайсці ў сваю школу па мікрараёне. Аддавайце туды дзіця з верай у належны вынік адукацыйнай дзейнасці і ў тое, што ў дзіцяці застануцца толькі найлепшыя ўражанні ад вучобы. Падумайце пра тое, што ў любой ўстанове адукацыі вас чакаюць высокапрафесійныя кадры, як педагічныя, так і кіраўніцкія, якія працуюць для таго, каб вашаму дзіцяці было добра».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«В Англию со Streamline»

Частное учреждение образования «Учебный центр «Образовательные технологии»
Утверждаю
Директор _____Э. Ч. Целюк
(Приказ № от «» года)

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «В Англию со Streamline» (далее – Игра).

1. Сведения об организаторе рекламной игры

Организатором Игры является Частное учреждение образования «Учебный центр «Образовательные технологии»» (далее – Организатор), зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом, Свидетельство о государственной регистрации от 06.05.2009 года № 0165499, УНП 191197619.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Захарова, 27/11-1Н.

2. Наименование рекламной игры

«В Англию со Streamline».

3. Территория проведения рекламной игры

Все офисы Частного учреждения образования «Учебный центр» образовательные технологии» в Республике Беларусь.

4. Период проведения рекламной игры

Игра проводится в период с 22 июля по 22 сентября 2019 года, включая розыгрыш.

5. Комиссия по проведению рекламной игры

Для контроля за ходом Игры создается комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры.

Председатель комиссии:

Политило Ольга Алексеевна – начальник отдела рекламы и маркетинга *Частного учреждения образования* «Учебный центр «Образовательные технологии».

Члены комиссии:

Гутковская Ирина Анатольевна – заместитель директора по рекламе и маркетингу *Частного учреждения образования* «Учебный центр «Образовательные технологии»;

Раков Андрей Александрович – специалист отдела рекламы и маркетинга *Частного учреждения образования* «Учебный центр «Образовательные технологии»;

Игнатович Наталья Леонидовна – специалист по рекламе *Частного учреждения образования* «Учебный центр «Образовательные технологии»;

Кульша Владимир Вацлавович – индивидуальный предприниматель Кульша В. В.

6. Наименование услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра

Игра проводится в целях стимулирования реализации услуг в сфере образования (обучение иностранным языкам), оказываемых Организатором.

7. Участники Игры

7.1.Участниками Игры (далее – Участник) могут быть граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь, соответствующей условиям настоящих Правил.

7.2. Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица и его близкие родственники.

7.3. Участник имеет право заполнить неограниченное количество купонов, советующее количеству оплаченных услуг Организатору Игры.

8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником рекламной игры

Для участия в рекламной игре Участнику необходимо в период с 22 июля 2019 года по 31 августа 2019 года включительно в офисах Организатора:

1. Оплатить семестр обучения по одной из основных учебных программ 2019—2020 года (курсов) по изучению иностранного языка, предлагаемых к изучению Организатором (далее – Участник).

2. Получить в офисах Организатора от специалистов по работе с клиентами купон участника розыгрыша (далее – Купон).

3. Заполнить Купон, указав следующие данные Участника:

- фамилия, имя, отчество;
- дата рождения;
- место проживания или регистрации (населенный пункт, улица, дом, корпус (при наличии), квартира);
- номер телефона Участника в формате «код оператора, номер абонента» (пример – YYXXXXXXX, где YY – код оператора, XXXXXXX – номер абонента);
- адрес электронной почты (e-mail) Участника (при его наличии);
- номер телефона Участника;
- дату заполнения Купона.

4. Самостоятельно опустить Купон в одну из опечатанных урн для купонов, установленных на территории проведения Игры (далее – урна для купонов):

- если Участник опускает свой Купон в Урну для купонов № 1 – он становится Участником Игры в розыгрыше призового фонда, состоящего из Пакета № 1;
- если в Урну для купонов № 2 – он становится Участником Игры в розыгрыше призового фонда, состоящего из Пакета № 2.

Участие в Игре несовершеннолетних, ограниченно дееспособных, недееспособных лиц осуществляется через их законных представителей в порядке, установленном действующим законодательством.

Организатор не несет ответственность за ошибки, допущенные Участником Игры при заполнении Купона.

9. Состав и размер призового фонда

Призовой фонд Игры состоит из пяти пакетов образовательных программ в Великобританию в период с 1 июня по 31 августа 2020 года двух видов.

Таблица 1. Призовой фонд Игры

№	Наименование приза	Кол-во, штук	Цена за единицу, рублей	Сумма, рублей
Пакет №1	- Билеты ОАО «Авиакомпания «Белавиа» по маршруту Минск—Лондон—Минск (включая сборы за обслуживание пассажиров в аэропорту и другие сборы, касающиеся перевозки). - Сертификат на обучение в одном из центров Oxford International Group в городах Лондон, Оксфорд, Брайтон, который включает в себя: - проживание 8 дней/7 ночей по типу полупансион (двухразовое питание) в принимающей семье в Великобритании; - 15 часов учебных занятий по изучению английского языка; - экскурсионно-развлекательная программа, согласно Таблице 2	2	1369,86	2739,72
Пакет №2	- Билеты ОАО «Авиакомпания «Белавиа» по маршруту Минск—Лондон—Минск (включая сборы за обслуживание пассажиров в аэропорту и другие сборы, касающиеся перевозки). - Сертификат на обучение в одном из центров Oxford International Group в городах Вустер и Брэдфилд, который включает в себя: - проживание 8 дней/7 ночей в резиденции; - питание – полный пансион; - 15 часов учебных занятий по изучению английского языка; - экскурсионно-развлекательную программу, согласно Таблице 3	3	2264,68	6794,04

Таблица 2. Экскурсионно-развлекательная программа Пакета № 1

День	Лондон	Оксфорд	Брайтон
День 1	Ознакомительная прогулка по району Гринвич	Ознакомительная прогулка по историческому центру Оксфорда	Посещение колеса обозрения и пирса Брайтона
День 2	Прогулка по району Ноттинг Хилл, экскурсия в королевский музей Виктории и Альберта	Посещение знаменитого колледжа Крайст-Черч	Экскурсия в город Чичестер, известный средневековым кафедральным собором и замком герцога Ричмондовского
День 3	Экскурсия по Лондону, Вестминстерское аббатство, здание Парламента, Биг-Бен и колесо обозрения	Прогулка по Ботаническому саду Оксфорда	Экскурсия в Портсмут – единственный в Великобритании город-остров
День 4	Экскурсия на Тауэрский мост и в крепость Тауэр	Экскурсия в Бленхеймский дворец	Экскурсия в средневековый замок Арундел
День 5	Экскурсия по району Найтсбридж	Посещение колледжа Святого Эдмунда	Экскурсия в портовый городок Литлхэмптон
День 6	Посещение Трафальгарской площади и Национальной галереи	Экскурсия в Бодлианскую библиотеку	Экскурсия в замок Лидс, резиденцию короля Эдварда I
День 7	Экскурсия на полный день в Оксфорд	Экскурсия на полный день в Лондон	Экскурсия на полный день в Оксфорд

Таблица 3. Экскурсионно-развлекательная программа Пакета № 2

День	Вустер	Брэдфилд
День 1	Ознакомительная экскурсия по г. Вустер	Ознакомительная прогулка по г. Рэддинг
День 2	Спортивные мероприятия на территории центра	Мероприятие – поиск сокровищ
День 3	Экскурсия в г. Стрэтфорд-на-Эйвоне с посещением Кэтбери-Ворлд	Поездка в г. Лондон на пешеходную экскурсию, вход в Национальную галерею
День 4	Мероприятия на территории центра	Мероприятия на территории центра
День 5	Экскурсия в г. Бат или Оксфорд с посещением колледжа Оксфорда	Международный вечер на территории центра
День 6	Прогулка по реке Северн, шопинг в магазине Буллринг	Дискотека и мероприятия на территории школы
День 7	Экскурсия на целый день в г. Бирмингем	Экскурсия в г. Оксфорд и вход в колледж Оксфорда

Победитель рекламной игры вправе сам определить сертификат на обучение в одном из центров Oxford International Group на образовательную программу предложенных Заинтересованным лицом, согласно выигранному Пакету в призовом фонде.

В призовой фонд не включены и оплачиваются самостоятельно победителями Игры: визовый (консульский) сбор, медицинская страховка, трансфер в/из аэропорта вылета (г. Минск).

Общий размер призового фонда составляет 9533,76 (девять тысяч пятьсот тридцать три) рубля и семьдесят шесть копеек.

Призовой фонд формируется в полном объеме на момент государственной регистрации Игры за счет имущества Организатора и имуществом Заинтересованного лица – Oxford International Education Group Private Limited Company New Kings Court Tollage, Chandler`s Ford, Eastleigh, Hampshire, SO53 3LG Company registration number: 02666738 (далее – Заинтересованное лицо) в следующем порядке:

- 5 (пять) авиабилетов по маршруту Минск—Лондон—Минск – Организатором;
- 5 (пять) пакетов образовательных программ в Великобританию – Заинтересованным лицом.

10. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, порядок определения победителей.

Розыгрыш призового фонда проводится 1 сентября 2019 года в 12.00 в кинотеатре Silver Screen в ТРЦ «Галилео», зал № 3 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Бобруйская, д. 6.

Розыгрыш призового фонда проводится открыто, в присутствии членов Комиссии, а также участников Игры.

Розыгрыш призового фонда проводится в следующем порядке:

Комиссией по проведению рекламной игры к месту розыгрыша с офисов Организатора доставляются все урны для купонов, которые вскрываются в присутствии членов Комиссии, а также участников Игры, присутствующих на розыгрыше.

Купоны участников Игры из Урн для купонов № 1 переносятся в лототрон первые, из которого при розыгрыше назначенное Организатором лицо извлекает 2 купона, которые фиксируются Комиссий в протокол заседания, как победители рекламной игры.

После этого все купоны извлекаются из лототрона и в лототрон помещаются все купоны из Урн для купонов № 2. Назначенное Организатором лицо извлекает 3 купона, которые фиксируются Комиссий в протокол заседания как победители рекламной игры.

11. Срок и способ информирования победителей игры

Организатор Игры информирует Участника о выигрыше в срок по 5 сентября 2019 года включительно письменным уведомлением на домашний адрес победителей, а также по телефонному номеру участника и (или) по адресу электронной почты участника (при его наличии).

12.Место, порядок и срок выдачи выигрыша

Вручение победителям Игры призов производится до 22 сентября 2019 года в офисе Организатора по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Немига, 5, офис 609, при предъявлении участниками Игры, имеющими право на получение призов, документа, удостоверяющего личность.

Победителям Игры (их законным представителям) Организатором передается приз. Победители (их законные представители) письменно подтверждают факт получения выигрыша и заполняют все необходимые документы, связанные с получением выигрыша и представленные Организатором и заинтересованным лицом.

13. Права и обязанности Участников Игры

13.1. Принимая участие в Игре, Участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя ответственность выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

13.2. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры.

13.3. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

13.4. Победители, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности. Необходимые для получения призов.

14. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил рекламной игры и результатов розыгрыша, сроки публикации.

14.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала игры.

14.2. Результаты розыгрыша Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 14 сентября 2019 года.

15. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры

В период проведения рекламной игры по вопросам, связанным с проведением рекламной игры обращаться по телефонам в (017) 349-70-07 и (29) 349-07-07 с 9.00 до 18.00 в рабочие дни, с 11.00 до 15.00 в субботу.

16. Другие условия

Приз не подлежит замене, выплата денежного эквивалента стоимости приза не осуществляется.

В случае возврата денежных средств за обучение по одной из предложенных программ в период проведения Игр Клиент лишается права быть Участником Игры.

Победитель не вправе передать выигрыш другому лицу на свое усмотрение.

Получение приза не гарантирует получение въездной визы в Великобританию.

Ответственность по уплате налогов, предусмотренных законодательством Республики Беларусь в связи с получением выигрыша, лежит на победителях Игры.

С момента передачи приза победителю к последнему переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом.

В случае отказа победителя от получения приза, неполучения приза в установленные настоящими правилами порядке и сроки либо невыполнения условий его получения приз остается у Организатора и используется последним по своему усмотрению.

Ответственность за оформление необходимых для путешествия документов несут победители рекламной игры.

Участие в рекламной игре означает ознакомление и полное согласие участников с настоящими правилами рекламной игры.

Организатор не оплачивает участникам игры расходы, связанные с проездом к месту проведения розыгрыша приза и получения приза.

САМЫ ЧЫСТЫ РАЙЦЭНТР У КРАІНЕ

Чаму ім стаў Мядзел?

Па выніках рэспубліканскага конкурсу Мядзел прызнаны адным з самых чыстых і добраўпарадкаваных райцэнтраў Беларусі. Карэспандэнт «МС» прагулялася па вуліцах населенага пункта і пацікавілася ў мясцовых камунальнікаў, як удалося дабіцца такога ідэальнага санітарнага стану.

Першае, што кідаецца ў вочы, — мноства скульптур, малых архітэктурных формаў. Не выключэнне і сквер каля гарадскога Дома культуры, дзе месцяцца работы вядомага ўмельца, разьбяра па дрэве Уладзіміра Хіхіча. Гэта не проста скульптуры, а тэматычныя кампазіцыі, якія ствараюць адзін цэласны ансамбль. У кожную з трох работ аўтар уклаў не толькі душу. Кожная з іх нясе пэўную сэнсавую нагрузку.

— Зроблены скульптуры з вязу, якая сыравіна была на той час пад рукой, тую і выкарыстаў, — расказаў майстра.— Нарачанскі край славіцца сваімі азёрамі. Таму я і падумаў, чаму б не абыграць гэтую тэму, ідэю падказала казка «Пра цара Салтана». Вось лебедзь, ён нібы падымае хвалю крыламі, з якой паяўляецца царэўна. Яе валасы ў палёце, пад касой — месяц. На каменным востраве Буяне расце дуб, над ім лятае каршун, у якога цэліцца царэвіч.

> Сёлета абноўлена больш за гектар газонаў, высаджана больш за 200 кустоў і 400 дрэў, 10 тысяч кветак, якія вырашчаныя ў цяплічнай гаспадарцы ЖКГ. Не застаюцца па-за ўвагай камунальнікаў і месцы агульнага карыстання, масавага адпачынку.

Маладзёжны сквер горада акрамя драўляных скульптур казачных персанажаў упрыгожвае некалькі каменных выяў. Іх аўтары — маладыя беларускія майстры, удзельнікі Мінскага абласнога пленэру па вырабе дэкаратыўных каменных скульптур, які праходзіў у Мядзеле, — пакінулі на памяць гораду сапраўдныя творы мастацтва. Кожны з іх мае сваю назву: «Сон ракі» — Івана Арцімовіча, «Дотык» — Арцёма Мядзведзева, «Глыбіня» — Аляксандра Сакалова.

Летась напярэдадні абласнога свята «Дажынкі», якое ладзілася ў Мядзеле, на набярэжнай возера Мястра з'явілася яшчэ адна цікавая работа — скульптура вугра. Менавіта гэтая рыба водзіцца ў мясцовых азёрах і па праве лічыцца сімвалам Нарачанскага краю.

— Нам вельмі прыемна, што камісія высока ацаніла нашу работу па ўтрыманні горада ў належным стане, — кажа **галоўны інжынер прадпрыемства «Мядзельская жыллёва-камунальная гаспадарка» Уладзімір ШАБОВІЧ.** — Летась перад «Дажынкамі» мы шмат зрабілі па добраўпарадкаванні горада і раёна ўсёй талакой — мясцовыя ўлады, работнікі нашага прадпрыемства, жыхары. Цяпер наша задача — захаваць гэтую прыгажосць і прымножыць. Кожны год мы імкнёмся ўнесці нешта новае ў інтэр'ер, афармленне як райцэнтра, так і курортнага пасёлка Нарач. Да нас едуць на адпачынак не толькі беларусы, але і замежнікі: расіяне, украінцы, госці з Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. І мы павінны трымаць марку, утрымліваць населеныя пункты ў чысціні і парадку.

Скульптура вугра.

Фота БелТА.

Нягледзячы на тое што шмат мерапрыемстваў ажыццёўлена было ў працэсе падрыхтоўкі да фестывалю працаўнікоў сяла, работа не спыняецца і цяпер. Сёлета абноўлена больш за гектар газонаў, высаджана больш за 200 кустоў і 400 дрэў, 10 тысяч кветак, якія вырашчаныя ў цяплічнай гаспадарцы ЖКГ. Не застаюцца па-за ўвагай камунальнікаў і месцы агульнага карыстання, масавага адпачынку. Прыемна прагуляцца ў спякоту па набярэжнай возера Мястра, пасядзець у зацені дрэў, паназіраць за гульнямі малых. Для іх тут абсталяваны і арэлі, і атракцыёны, і горкі, і пераходы, і нават пераходзік. Попытам сярод жыхароў і гасцей Мядзела карыстаецца пляж з усім неабходным — тапчанамі, кабінкамі для пераадзявання, парасонамі ад спякотнага сонца.

— Шмат увагі аддаём і сельскім населеным пунктам, дзе сёлета заасфальтавалі 1,5 кіламетра вуліц, — працягвае Уладзімір Аркадзевіч. — Плануем пакласці яшчэ каля двух кіламетраў цвёрдага пакрыцця, а таксама капітальна адрамантаваць адну дваровую тэрыторыю ў самім Мядзеле.

— Вядома, каб утрымліваць горад і раён у добрым стане, прымнажаць набыткі, неабходны сродкі, ды немалыя. Ці не так, Уладзімір Аркадзевіч?

— Летась у межах падрыхтоўкі да «Дажынак» з абласнога бюджэту было выдзелена каля двух мільёнаў рублёў. Сёлета раён выдатаваў каля аднаго мільёна 300 тысяч рублёў для далейшага развіцця тэрыторый. У добраўпарадкаванне ўкладваем і сродкі са сваіх даходаў, штогод недзе каля 500 тысяч рублёў.

— Відаць, добрым падспор'ем для далейшага развіцця стануць і прэміяльныя?

— За перамогу ў рэспубліканскім конкурсе нам належыць 1500 базавых велічынь, гэта 38 250 рублёў. Частка іх прызначана на заахвочванне тых, хто ствараў гэтую прыгажосць, наводзіў чысціню і парадак. Астатнімі пастараемся распарадзіцца па-гаспадарску, з карысцю для ўсяго горада. Магчыма, купім механізмы для прыборкі вуліц, інвентар для абкошвання травы. Хочам набыць і новыя малыя архітэктурныя формы, каб гараджанам яны нагадвалі аб перамозе ў конкурсе.

Усяго ў добраўпарадкаванні тэрыторый занятыя 17 работнікаў прадпрыемства.

— У нас падабраўся дружны калектыў, які хварэе за справу. Узначальвае яго майстар Алег Рагіня. Алег Янавіч на рабоце і ў святы, і ў выхадныя, і вечарам, і раніцай. Ён умее арганізаваць людзей на плённую працу. Ну і вядома, цяжка было б нам справіцца з навядзеннем парадку без сумленных гараджан, якія падтрымліваюць чысціню каля сваіх дамоў, на дваровых тэрыторыях.

Пакідала я Мядзел у спякоту. Але, як заўсёды, на сваім пасту былі работнікі камунальнай гаспадаркі: паліваліі кветкі, збіралі смецце. «У людзей пляжная пара, а ў нас гарачая», — пажартавалі яны. І з гэтым нельга не пагадзіцца.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Утерянное представительством Белгосстраха по Солигорскому району Страховое свидетельство по ОСГОВТС (внутреннее) серия ВВ № 9489110 в количестве 1 шт. **считать недействительным.** УНН 100122726

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест», форма 2РНП (серия ПЕ) № 0441508, **считать недействительным.**

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
вносит изменение в извещение, опубликованное в номере от 05.07.2019, по продаже Капитального строения с инв. № 700/С-92553 – Магазин.
Начальная цена продажи: 22 100,10 бел. руб. с учетом НДС.
Аукцион состоится 6 августа 2019 года в 12.00. УНП 190055182
Дополнительную информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25

АБСОЛЮТБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2019 г.

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» *(в тысячах белорусских рублей)*

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2019	01.01.2019
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	19 065	12 678
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	7 820	3 976
5	Средства в банках	1104	13 149	41 816
6	Ценные бумаги	1105	33 409	6 337
7	Кредиты клиентам	1106	11 349	21 932
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	11	11
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	6 753	7 111
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	372	151
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	1 343	2 367
13	Отложенные налоговые активы	1112	7	7
14	Прочие активы	1113	2 230	2 377
15	**ИТОГО активы**	**11**	**95 508**	**98 763**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	7	12
19	Средства клиентов	1203	36 453	36 784
20	Ценные бумаги банка	1204	-	4 336
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	391	788
24	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**36 851**	**41 920**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	39 331	39 331
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	2 783	2 651
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	3 370	3 366
30	Накопленная прибыль	1215	13 173	11 495
31	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**	**58 657**	**56 843**
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**	**95 508**	**98 763**

ОТЧЕТ
о прибылях и убытках
на 1 июля 2019 г.

ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» *(в тысячах белорусских рублей)*

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2019	01.07.2018
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	2 965	4 106
2	Процентные расходы	2012	212	710
3	Чистые процентные доходы	201	2 753	3 396
4	Комиссионные доходы	2021	687	489
5	Комиссионные расходы	2022	311	371
6	Чистые комиссионные доходы	202	376	118
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	39	184
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	2 103	2 804
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	(520)	776
12	Прочие доходы	208	1 900	457
13	Операционные расходы	209	5 682	4 891
14	Прочие расходы	210	44	41
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	1 965	1 251
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	157	308
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**1 808**	**943**

Руководитель В.И. Вашкевич

Главный бухгалтер О.С. Турбина

Дата подписания: 9 июля 2019 г.

Отчетность о деятельности ЗАО «АБСОЛЮТБАНК» в полном объеме размещена на сайте www. absolutbank.by в разделе «О банке» в рубрике «Финансовая отчетность»

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 9 от 06.12.2018. УНП 100331707

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 18 ліпеня 2019 года.